Палейка Алена Аляксандраўна
*http://paleika.lyceum2.minsk.edu.by*

## Метадычныя рэкамендацыі па правядзенні творчых урокаў

Паважаныя калегі!

Перад вамі метадычныя распрацоўкі планаў-канспектаў правядзення творчых урокаў, у якіх спалучаюцца разнастайныя і неардынарныя прыёмы дзейнасці на ўроках. У прапануемых матэрыялах акцэнт зроблены на дзейнасць настаўніка і плануемыя вынікі работы. Таксама прадстаўлены інфармацыя і даведачны матэрыял, некалькі варыянтаў правядзення ўрокаў. «Разнастайнасць, даступнасць, практычнасць!» так можна сфармуліраваць сутнасць такіх урокаў.

На магчымасць прымянення асноўных прынцыпаў стварэння творчых урокаў на практыцы ўплываюць як ўзроставыя асаблівасці вучняў, так і ўзровень іх падрыхтаванасці, профіль навучання, спецыфіка адукацыйнай установы і іншае. Таму, каб не звужаць магчымасць ужывання метадычных распрацовак нейкім цэнзам, мы прапануем настаўніку самому выбіраць іх, улічваючы ўсе ўзгаданыя фактары.

Аўтарам пры выкарыстанні педагагічных тэхналогій перавага аддаецца *гульнемадэліраванню* і *праектнай дзейнасці*, якія лічацца вельмі перспектыўнымі пры дасягненні комплекса вучэбных, выхаваўчых і развіваючых мэт сучаснага ўрока гісторыі.

Планы-канспекты сістэматызаваны ў адпаведнасці з тэмамі вучэбнай праграмы. У табліцы зместу гэтага раздзела дапаможніка прыводзяцца тэмы вучэбнай праграмы і формы правядзення творчых урокаў.

## Змест раздзела

| Раздзел, тэма вучэбнай праграмы | Формы правядзення творчых урокаў |
|---|---|
| ***Раздзел I.*** Першабытнае грамадства на тэрыторыі Беларусі | *Музей першабытнасці:* стварэнне экспазіцый і правядзенне экскурсій вучнямі (урок абагульнення). |
| ***Раздзел II.*** Беларускія землі ў канцы V — першай паловеXIII ст. Дзяржаваўтваральныя працэсы на тэрыторыі Беларусі ў IX — сярэдзіне XIII ст.<br><br>Хрысціянізацыя беларускіх зямель. | *Гістарычны дэтэктыў:*<br><br>мадэліраванне судовага разбіральніцтва па справе гістарычнага дзеяча Святаполка Акаяннага (урок замацавання і сістэматызацыі новых ведаў ). |
| ***Раздзел III.*** Беларусь у другой палове XIII — сярэдзіне XIV ст.<br><br>Становішча беларускіх зямель у складзе ВКЛ у XIV—XV стст. | *Навіны сярэднявечча:* спаборніцтва каманд вучняў ў стварэнні «праграм навін» унутранай і знешняй палітыкі Вялікага княства Літоўскага ў XIV—XV стст. (урок замацавання і сістэматызацыі новых ведаў). |
| ***Раздзел IV.*** Беларускія землі ў сярэдзіне XVI—XVIII стст.<br><br>Рэфармацыйны рух у ВКЛ.<br><br>Эпоха Асветніцтва і яе ўплыў на развіццё культуры Беларусі.<br><br>Наш край ў сярэдзіне XVI—XVIII стст. | *Дыспут аб веры:* гістарычная рэканструкцыя дыспута па пытаннях рэлігіі (урок замацавання і сістэматызацыі новых ведаў ).<br>*Інтэлектульны марафон:* ад Адраджэння да Асветніцтва (урок замацавання і сістэматызацыі новых ведаў ).<br>*Круглы стол:* сістэмны крызіс Рэчы Паспалітай. (урок абагульнення). |

## Музей першабытнасці

*Урок:* паказ творчых праектаў экскурсаводаў (праверка дамашняга задання).

*Мэты ўрока.*

*Вучэбная:* паўтарэнне ўсяго матэрыяла, яго абагульненне і сістэматызацыя ведаў вучняў па тэме «Гаспадарка, грамадскі лад першабытных людзей», канкрэтызацыя агульных уяўленняў і ведаў, прымяненне ведаў у новай, нетыповай сітуацыі.

*Выхаваўчая:* стымуляванне здольнасцей сацыяльнай інтэграцыі і культуры дыскусіі, павышэнне веры ў свае магчымасці.

*Развіваючая:* стымуляванне пашырэння кола інтарэсаў, развіццё крэатыўных якасцей асобы.

*Тэхналогіі:* праектная, гульнемадэлірванне.

*Падрыхтоўка да ўрока:* па сутнасці, урок уяўляе сабой прагляд групавых праектаў вучняў па тэме першабытнага грамадства. Таму вельмі важна правільна яго спланаваць і падрыхтаваць. Асноўная ідэя ўрока: *далучэнне вучняў да музейнай справы.*

***Этапы***

1. Абвяшчэнне назваў праектаў — музейных экспазіцый па наступных раздзелах — «Прыродна-кліматычныя ўмовы жыцця першабытных людзей на тэрыторыі Беларусі», «Эвалюцыя прылад працы і зброі старажытных людзей», «Грамадскі лад першабытнасці», «Духоўная культура першабытных людзей».
2. Фарміраванне рабочых груп па колькасці праектаў. Выбар членамі групы кіраўніка праекта.
3. Азнакамленне з планам працы па праекту, падзел працы ў групе.
4. Збор інфармацыі, яе сістэматызацыя. Фарміраванне экспазіцыі.
5. Афармленне экспазіцыі. Стварэнне суправаджэння (словы экскурсавода).

6. Прэзентацыя свайго праекта — правядзенне экскурсіі.
7. Падвядзенне вынікаў.

Схема працы па групавому праекту «Экскурсія па музеі першабытнасці»

| Этап | Дзейнасць | Вынік | Адказны |
|---|---|---|---|
| Арганізацыйны | Фармулёўка асноў-най ідэі кампазіцыі;<br>падзел працы ў групе. | Вызначана ідэя кампазіцыі;<br>кожны член групы атрымаў сваё заданне. | |
| Падрыхтоўчы | Пошук інфармацыі і яе апрацоўка; адбор «артэфактаў» для кампазіцыі; напісанне тэкста суправаджэння экспазіцыі. | Сфарміраваны асноўныя блокі — раздзелы кампазіцыі (ар-тэфакты — малюнкі, слайды, фота ці інш.);<br>падрыхтаваны тэкст супра-ваджэння (сістэматызацыя па экспазіцыі у цэлым);<br>падрыхтаваны экскурсаводы; | |
| Карэкцыйны | Кансультацыі з настаўнікам па ўсёй экспазіцыі;<br>выпраўленне памылак. | Падрыхтаваны канчатковы варыянт экспазіцыі; | |
| Прэзентацыя; | Правядзенне экскурсіі па экспазіцыі музея. | Афармленыя матэрыялы экспа-зіцыі (мультымедыйная презен-тацыя з тэкстам экскурсавода, ці набор малюнкаў з тэкстам суправаджэння, ці інш.) | |
| Выніковы | Абмеркаванне і ацэньванне праектаў вучнямі і настаўнікам. | Адзнакі за працу па праекце (індывідуальныя). | |

## Тлумачэнне для настаўніка

Каб арганізаваць плённую працу вучняў па праектах настаўніку неабходна задаць пэўны накірунак, падказаць, дзе шукаць інфармацыю, даць парады па логіцы выбудоўвання музейнай экспазіцыі. Што такое музей? Гэта не проста сховішча каштоўных артэфактаў — рэчавых і пісьмовых гістарычных помнікаў, але гэта іх сістэматызаваная падача, аб'яднаная пэўнай ідэяй. Музей першабытнасці — гэта музей толькі рэчавых помнікаў, ніякіх пісьмовых крыніц па гэтаму перыяду быць не можа. Але ідэя, якая будзе яднаць іх у адзінае цэлае, павінна быць абавязкова, негледзячы на тэматыку экспазіцыі.

| **Тэма экспазіцыі** | **Асноўныя ідэі** | **Артэфакты** |
|---|---|---|
| Прыродна-кліматычныя ўмовы засялення і жыцця першабытных людзей на тэрыторыі Беларусі. | Сфарміраваць уяўленне аб зменах клімату, раслiннага і жывёльнага света як .прыродных фактарах антрапасоцыягенеза (ад 40—35 тыс. гадоў таму да сучаснага стана).<br>Прасачыць змены засялення тэ-рыторыі Беларусі даіндаеўрапейскі-балцкі-славянскі перыяды | 1. След ледавіка (камні, валуны, азёры), рэшткі раслін і жывёл (біўні маманта і інш.).<br>2. Назвы гідронімаў |
| Эвалюцыя прылад працы і зброі старажытных людзей. | Прадставіць змены прылад працы па схеме прысвойвальная вытворчая гаспадарка, адлюстраваныя ў перыядах:<br>каменны — бронзавы — жалезны<br>(прадставіць асноўныя археала-гічныя культуры па кожнаму з перыядаў). | Зброя і прылады працы;<br>посуд; |
| Грамадскі лад першабыт-насці. | Прадставіць змены ў грамадскім ладзе па схеме:<br>статак → родавая абшчына (матрыярхат → патрыярхат) → суседска-родавая абшчына.<br>Прасачыць ролю неалітычнай рэвалюцыі ў развіцці першабытнага грамадства. | Выгляд людзей (рэканструкцыі, фізічны тып,);<br>Рэшткі, па якіх можна вызначыць ролю жанчыны і мужчыны («познепалеалітычныя венеры», зброя). |
| Духоўная культура першабытных людзей. | Сфарміраваць уяўленне аб першабытных вераваннях: фетышызм-татэмізм-анімізм-магія. | Малюнкі, статуэткі, музычныя інстру-менты, упрыгожанні, арнамент. |

Вучні, працуючы з матэрыялам, павінны будуць адабраць з мноства артэфактаў самыя прэзентабельныя, найбольш яскрава ўвасабляючыя тыя думкі, якія яны абараняюць. Гэта могуць быць фота, малюнкі, слайды. Лепш за ўсё рабіць такія экскурсіі з дапамогай мультымедыйных сродкаў, але можна справіцца і без іх, і нават намаляваць даволі сімвалічна рэчы экспазіцыі на дошцы.

Праца над зместам тэкста суправаджэння дазволіць вучням прывесці свае веды ў сістэму, упарадкаваць іх па пэўнаму прынцыпу, удасканаліць свае ўменні фармуляваць вывады. Цалкам магчыма, што складаць тэкст будуць адны вучні, а «працаваць» экскурсаводамі — іншыя. Цікава сачыць, як члены групы будуць выбіраць тых людзей, які трэба будзе «падаваць іх тавар» — экспазіцыю. Вялікім поспехам можна лічыць рашэнне вашых навучэнцаў самастойна наведаць які-небудзь музей, каб пераняць вопыт. Можна таксама пры падрыхтоўцы экскурсавода параіць розныя прыёмы для трымання ўвагі экскурсантаў. Напрыклад, наступныя фразы: «Звярніце ўвагу, перад вамі жамчужына нашай калекцыі…», ці «А гэта знаходка была зроблена пры выпадковых ўмовах», «Выпадак, звязаны з гэтым артэфактам, незвычайны», «Таямніца гэтага экспаната яшчэ не раскрытая» і г. д.

Урок-экскурсія будзе адбывацца па наступнаму плану: усе вучні ў складзе сваіх груп пабываюць на трох экскурсіях і правядуць адну сваю, таму трэба разлічыць час, не больш дзесяці хвілін па паказ экспазіцыі. Такім чынам, адбудзецца паўтарэнне ўсяго матэрыяла, яго абагульненне і сістэматызацыя і ўсе атрымаюць адзнакі.

Ацэньваць групавыя праекты можна па наступнай шкале (ад 0 да 10 балаў):

| | **Змест**<br><br>**(падбор экспазіцыі, адпаведнасць тэме)** | **Сістэма**<br><br>**(звязанасць частак са зместам цэлага)** | **Арыгінальнасць**<br><br>**(уласны твар, асаблівасці)** | **Прэзентацыя**<br><br>**(падача матэрыяла, прыёмы, афармленне)** | **Вынік** |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 група | | | | | |
| 2 група | | | | | |
| 3 група | | | | | |
| 4 група | | | | | |

Трэба ацаніць уклад кожнага вучня. Гэта зробяць члены групы, якія на асобным аркушы паперы павінны выставіць адзнакі кожнаму ўдзельніку праекта і сабе таксама. Гэтыя матэрыялы збірае настаўнік і карыстаецца імі пры выстаўленні адзнак.

Схемай падрыхтоўкі і правядзення ўрока-экскурсіі па музеі можна карыстацца, вывучаючы любую тэму па гісторыі.

**Літаратура для ўрока «Музей першабытнасці»:**


1. *Исаенко, В. Ф.* Археологическая карта Белоруссии. Вып. 1. Памятники каменного века. Мінск. 1968.
2. Ілюстраваная храналогія гісторыі Беларусі. Мінск. 1995.
3. *Калечиц, Е. Г.* Первоначальное заселение территории Белоруссии. Мінск. 1984.
4. Першабытная эпоха. Гісторыя Беларусі ў 6 тамах. Т 1. Старажытная Беларусь. Мінск, 2000.
5. *Рыбаков, Б. А.* Язычество древних славян. М., 1981.
6. *Седов, В.* Восточные славяне в VI—VII вв. М., 1982.
7. *Штыхаў, Г. В.* Ажываюць сівыя стагоддзі. Мінск, 1974.
8. *Штыхаў, Г. В.* Крывічы. Мінск. 1992.
9. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т.1. Артыкулы: Археалагічная культура, Археалогія. Мінск, 1993.

## Гістарычны дэтэктыў: мадэліраванне судовага разбіральніцтва па справе гістарычнага дзеяча Святаполка Акаяннага

Тлумачэнне для настаўніка

На ўроках гісторыі праводзяцца практычныя заняткі. А што яны сабой уяўляюць? Гэта, ў першую чаргу, праца з дакументамі і іншымі матэрыяламі, набліжаная да рэальных умоў працы гісторыка ў архіве, на археалагічным раскопе, у краязнаўчай экспедыцыі, у музеі і г.д. На ўроку часцей за ўсё гэта праца з практыкумамі па гісторыі Беларусі, у якіх змешчаныя фрагменты з дакументаў для аналіза. Як жа арганізаваць такі занятак, каб ён быў цікавы для вучня, бо проста праца з дакументамі не захапляе навучэнцаў, многія ледзь не пазяхаюць і проста чакаюць канца нуднага ўрока. Адказ такі — трэба арганізаваць правядзенне ўрока ў форме гульні.

Пачнём наш гістарычны дэтэктыў. Справа у тым, што нам трэба будзе змадэліраваць на ўроку пасяджэнне суда, на якім будзе разглядацца «справа» нейкага гістарычнага дзеяча. Тут галоўная праблема для настаўніка — падабраць такія гістарычныя персаналіі, абставіны жыцця якіх добра ілюстравалі б эпоху ў неабходным па праграме тэматычным разрэзе: палітыка, эканоміка, рэлігія ці інш. Лепш за ўсё праводзіць «урок-суд», калі патрабуецца замацаванне вывучаемага матэрыялу, напрыклад, на семінарскім занятку. Сутнасць занятка ў тым, што неабходна будзе правесці судовае разбіральніцтва па справе гістарычнага дзеяча па ўсім правілам юрыспрудэнцыі: павінен быць прадстаўлены бок абвінавачвання і бок абароны, таксама сведкі і, абавязкова, суддзя і прысяжныя. Урок будзе насіць характар адкрытага спаборніцтва паміж бокам абвінавачвання і бокам абароны, а канчатковае рашэнне будзе за прысяжнымі, якія вынесуць свой вердыкт. Такім чынам, вучні на ўроку павінны будуць з дапамогай памяткі ўсведамляць пэўныя правілы правядзення судовага пасяджэння і свае ролі пры гэтым, а таксама ўдасканальваць свае ўменні і навыкі крытычнага мыслення, аналізаваць і рабіць высновы па прапануемым гістарычным

матэрыяле, а таксама лагічна выбудоўваць тэкст, аргументаваць свой пункт гледжання, дыскутаваць. Такія урокі звычайна праходзяць «на адным дыханні» і маюць вельмі вялікую навучальную карысць. У якасці прыкладу прыводзіцца ўрок «Справа Святаполка Акаяннага». Чаму менавіта справа Святаполка Акаяннага? І якое дачыненне яна мае да працэсаў дзяржаваўтварэння на тэрыторыі Беларусі?

***Па-першае***, гэты ўрок мае вельмі добрае праблемнае поле — гэта палітычныя працэсы ў сувязі з хрысціянізацыяй Русі, якая абвастрыла супярэчнасці паміж насельніцтвам зямель і цэнтрам, паміж старэйшымі і малодшымі сынамі князя Уладзіміра.

***Па-другое***, вызначаецца месца Турава сярод земляў Кіеўскай Русі — гэта быў горад, у якім княжыў будучы князь кіеўскі. Таму сувязі Турава з Кіевам адрозньваюць яго становішча ад Полацка, які заўсёды быў цэнтрам змаганняў за самастойнасць кіравання. Распрацоўка дадзенай праблемы дазволіць праясніць працэсы барацьбы за ўладу, яе вынікі і наступствы.

***Па-трэцяе***, каларытныя персаналіі — Святаполк па прозвішчу Акаянны, Яраслаў Мудры, Уладзімір Чырвонае Сонейка і інш. Як і чаму адзін — Мудры, а другі — Акаянны? Гэта пастаноўка пытання заставіць вучняў крытычна глядзець на гістарычны матэрыял, навучыць імкнуцца да вывучэння мноства крыніц і г.д.

***Па-чацвёртае***, па вывучаемаму перыяду гісторыі ёсць вялікая колькасць даступных адаптаваных крыніц, з якімі можна плённа працаваць.

***Па-пятае,*** змест матэрыялу добра ўкладваецца ў паняцце «гістарычны дэтэктыў», што выклікае дадатковы вучнёўскі інтарэс.

**Гульня «Незалежнае расследванне». «Справа Святаполка Акаяннага»**

*Умовы гульні і абсталяванне:* школьны пакой, стылізаваны пад залу судовых пасяджэнняў: ёсць асобнае месца для суддзі, сакратара, насупраць адзін аднаго размяшчаюцца абвінавачаны з адвакатам і пракурор з пацярпеўшым. За асобным сталом засядаюць прысяжныя. Сведкі да запрашэння ў пакой судовага пасяджэння знаходзяцца ў калідоры.

Падрыхтоўка да гульні

Настаўніку неабходна азнаёміцца са зместам кнігі Г.М. Філіста «История «преступлений» Святополка Окаянного» і іншымі творамі са спісу рэкамендаванай літаратуры. Настаўнік рыхтуе пакеты матэрыялаў для ўдзельнікаў працэса і за тыдзень да ўрока раздае іх пасля размеркавання роляў. Тлумачыць абавязкі ўдзельнікаў працэса.

Выбар па жрэбію ці назначэнне настаўнікам: суддзі, групы абвінавачвання (пракурор і памочнік), групы абароны (адвакат і памочнік), прысяжных (астатнія вучні класа ), а таксама Святаполка Уладзіміравіча (абвінавачаны), пацярпеўшага Яраслава Уладзіміравіча, сведку Эймунда.

Пасля размеркавання роляў удзельнікі працэсу атрымліваюць хатняе заданне: вывучыць прадстаўленыя дакументальныя звесткі (вытрымкі з летапісаў, сагаў, агіяграфічных твораў) і літаратуру, якую рэкамендаваў настаўнік, з дапамогай апорных канспектаў скласці тэкст свайго выступлення на судовым пасяджэнні.

Правілы судовага пасяджэння і абавязкі ўдзельнікаў

(выдаецца кожнаму ўдзельніку працэса).

*Суддзя* абвяшчае тэму судовага пасяджэння :»Разглядаецца справа Святаполка Акаяннага», вядзе судовы працэс, прадстаўляе слова спачатку пракурору, потым адвакату. Пасля выступленняў ім даецца магчымасць

скарэктыраваць свае аргументы. Пасля суддзя адпраўляе прысяжных для вынясення вердыкта, заслухвае вердыкт, а потым зачытвае прыгавор суда.

*Сакратар* выклікае сведкаў, вядзе пратакол судовага пасяджэння, перадае суддзі дакументы.

*Пракурор і памочнік* адбіраюць з прадстаўленых дакументаў, пісьмовых крыніц і іншых матэрыялаў тыя, з дапамогай якіх абвінавачваюць падсудзімага ў злачынствах (прадстаўляюць базу доказаў) і патрабуюць для падсудзімага пакарання.

*Адвакат і памочнік* адбіраюць з прадстаўленых дакументаў, пісьмовых крыніц і іншых матэрыялаў, тыя, з дапамогаў якіх абараняюць падсудзімага ад абвінавачвання ў злачынствах (прадстаўляюць базу доказаў) і патрабуюць для падсудзімага вызвалення ці реабілітацыі яго імя.

*Прысяжныя* ўважліва слухаюць суддзю, пракурора і адваката, потым выдаляюцца і прымаюць рашэнне і адказваюць на пытанні суддзі.

*Абвінавачаны* адказвае на пытанні пракурора, адваката, суддзі.

*Пацярпеўшы* адказвае на пытанні пракурора, адваката, суддзі

*Сведкі* адказваюць на пытанні пракурора, адваката, суддзі.

(Памятка выдаецца кожнаму удзельніку працэса)

Пытанні, адказваючы на якія, пракурор і адвакат, «будуюць» свае выступленні:

1. Якая абстаноўка склалася на Русі пасля смерці князя Уладзіміра? Як гэта звязана з прыняццем хрысціянства?
2. Які існаваў парадак наследвання прастола кіеўскага?
3. Каму была выгадна смерць сыноў Уладзіміра?

4. Як гэтыя падзеі падаюцца ў розных гістарычных крыніцах? Характар крыніц. Ці ёсць супярэчнасці і моманты, якія насцярожваюць (перадузятасць, ачарненне ці ўзвышэнне і г. д.)?

---

## Рэкамендаваная літаратура:


1. Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст. Хрэстаматыя / Пад рэд. Г. В. Штыхава. Мінск, 1998.
2. Сага аб Эймундзе.
3. *Філіст, Г. М.* «История «преступлений» Святополка Окаянного» Мінск, 1990.
4. Сага аб Эймундзе.
5. Казанне аб Барысе і Глебе.
6. Древняя русская литература. Хрестоматия. / Сост. Н. И. Прокофьев. М., 1988.
7. О разгроме Святополка Ярославом Мудрым (Повесть временных лет).

**Паважаныя калегі! Калі складана ўявіць, як можа праходзіць такі урок, можна скарыстацца настапным матэрыялам. Напрыклад, як праходзіў гэты урок у нашым ліцэі.**

**Ход урока:**

Арганізацыйны момант: усе займаюць свае месцы адпаведна ролі, якую будуць выконваць у гульні.

**Уступнае слова настаўніка**

Гісторыя не заўсёды справядлівая да сваіх герояў. Адны з іх раз і назаўсёды пастаўлены на п’едэстал і ўслаўлены, а другія — назаўсёды з кляймом ганьбы. Гэта датычыцца як сучаснай, так і старажытнай гісторыі, у якой — з аднаго боку венцаносная Вольга, Святы Уладзімір, Яраслаў Мудры, з другога боку — Алег Вешчы, Святаполк Акаянны, Усяслаў Чарадзей. Пісьмовымі крыніцамі па гэтаму перыяду ў асноўным з’яўляюцца старажытнарускія летапісы, але яны даволі тэндэцыйныя, таму што дзейнасць гістарычных дзеячоў у іх разглядаецца з пункта гледжання адносін да хрысціянства і хрысціянізацыі, бо складалі іх манахі. Прыйшоў час паглядзець на падзеі гэтых гадоў з дапамогай іншых крыніц — хронік замежных аўтараў і скандынаўскіх сагаў. Каштоўнасць гэтых крыніц, якія дапаўняюць старажытнарускія летапісы і жыццёйную літаратуру, у тым, што іх стваральнікі не былі зацікаўлены асвятляць ці тлумачыць падзеі на Русі ў кантэксце ўхвалення перамогшых у барацьбе за ўладу. Сёння мы з вамі разгледзім справу Святаполка Акаяннага. За што яго так празвалі? Што за працэсы адбываліся на Русі ў пачатку XI стагоддзя? Якія наступствы яны мелі? На гэтыя пытанні паспрабуе адказаць наша следства. Прадстаўляю сённяшніх удзельнікаў працэса над Святаполкам Акаянным.

Настаўнік прадстаўляе вучняў, потым перадае слова суддзі. Суддзя па чарзе дае слова пракурору, адвакату, заслухваюцца паказанні сведкаў. Паміж

абвінавачваннем і абаронай адбываецца барацьба. Урок можа праходзіць прыкладна па наступным сцэнарыі.

*Суддзя.* — Разглядаецца справа князя тураўскага, потым кіеўскага Святаполка Уладзіміравіча па мянушцы «Акаянны», 975 года нараджэння, які абвінавачваецца ў развязванні міжусобнай вайны і забойстве сваіх братоў Барыса і Глеба, за смерць якіх адпомсціў прысутнічаючы ў зале судовага пасяджэння ноўгарадскі, а потым кіеўскі князь Яраслаў Уладзіміравіч па мянушцы «Мудры». Слова прадстаўляецца пракурору.

*Пракурор.* — Абставіны справы наступныя. Да 988 года князь Уладзімір Святаславіч з мэтай умацавання кіеўскай дзяржавы ліквідаваў племянныя княженні і накіраваў у важнейшыя землі сваіх сыноў, пакінуўшы за сабой кіеўскую зямлю. Уладзімір Святаславіч некалькі разоў быў жанаты і меў шмат дзяцей ад розных жонак. Ягоныя сыны былі нашчадкамі бацькі і займалі свае пасады ў гарадах Кіеўскай Русі адпаведна старшынству: больш старэйшы атрымліваў больш значны пасад — горад з землямі. Але з дапамогай сыноў аб’яднаць сваю дзяржаву Уладзімір не змог і для гэтай мэты было прынята хрысціянства. Прыняцце хрысціянства не вырашыла праблему, а абвастрыла яе, бо частка сыноў Уладзіміра прыняла хрысціянства, а частка не прыняла і змагалася з ім як з чарговай спробай цэнтралізацыі ўлады, якая навязвалася з Кіева. Уладзімр памёр у 1015 годдзе, а пасля яго смерці барацьба за ўладу абвастрылася. Святаполк, сеўшы на пасад ў Кіеве, вырашыў пазбавіцца ад сваіх канкурэнтаў і, наняўшы забойцаў, ліквідаваў сваіх братоў Барыса і Глеба, гэта вядома дакладна (адпаведна пісьмовым крыніцам — летапісам), а таксама верагодна ён павінны ў смерці свайго брата Святаслава. Мы можам прадставіць доказы.

*Суддзя.* — Абвінавачаны, вы згодны з прадстаўленымі абвінавачваннямі?

*Святаполк Уладзіміравіч.* — Не.

*Суддзя.* — Слова прадстаўляецца адвакату.

*Адвакат.* — Паважаныя прысяжныя! Паглядзіце на гэтага чалавека (паказвае на Святаполка) і адкажыце мне на пытанне. Навошта яму было забіваць сваіх братоў, калі ён па праву старшынства заняў пасад кіеўскі як старэйшы сын пасля смерці свайго бацькі? Яшчэ пры жыцці князя Уладзіміра ён сядзеў пасаднікам у Тураве, а мы ўсе ведаем, што менавіта Тураў з'яўляўся стартавай пляцоўкай для князёў кіеўскіх. Такім чынам, сам Уладзімір Святаслававіч бачыў свайго сына Святаполка сваім пераемнікам, князем кіеўскім і ён заняў гэты пасад цалкам на законных падставах. Таму Святаполку не была карысна смерць ягоных малодшых братоў і гэтыя злачынствы зрабіў другі чалавек, які не меў законных падстаў для заняцця кіеўскага пасада. Нам у рукі трапіў каштоўны дакумент — «Сага аб Эймундзе» і мы запрасілі спадара Эймунда, які служыў кіраўніком дружыны князя наўгародскага Яраслава Уладзіміравіча ў якасці сведкі ў залу судовых пасяджэнняў.

У залу запрашаецца Эймунд.

*Суддзя.* — Вы вараг Эймунд з Нарвегіі, які быў кіраўніком дружыны Яраслава Уладзіміравіча, князя наўгародскага, а цяпер кіеўскага?

*Эймунд.* — Так.

*Суддзя.* — Адказвайце на пытанні адваката.

*Адвакат.* — Вы знаходзіліся на службе ў князя Яраслава і выконвалі яго распараджэнні? Што вы можаце сказаць наконт наступных радкоў сагі: «Конунг Эймунд так сказал своим товарищам: «Надо здесь остановиться. Я сведал, что конунг Бурислейф в этом месте будет иметь ночлег и учредит свой стан к ночи.»…Эймунд ещё с вечера тщательно затвердил в памяти то место, где конунг спит в своей палатке; он двинулся туда и быстрыми ударами нанёс смерть ему… Достав Бурислейфову голову, он пустился бежать в лес… Вместе с товарищами утром он пошёл прямо к конунгу

Ярислейфу : «Вот тебе голова, господарь! Можешь ли ты ее узнать?» Конунг Ярислейф отвечал: «Опрометчивое дело вы сделали и на нас тяжко лежащее! Но вы же должны озаботится и его погребением». …Тогда срубили они гроб, приложили голову к телу и поехали с ним домой в Киев. Тогда и сделалось погребение Бурислейфа известное многим лицам. После этого народ той страны поступил в руки к Ярислейфу, поклявшись ему присягою, и он сделался конунгом тех владений, в которых прежде они княжили вдвоём».

*Эймунд.* — Так і было. Я яшчэ раз гавару: мы дзейнічалі па загаду конунга Ярыслейфа. Гэта быў яго загад, мы толькі выконвалі яго.

*Пракурор.* — Я настойваю, каб судовае пасяджэнне даведалася аб тым, што Яраслаў Уладзіміравіч пасварыўся з конунгам Эймундам, які запрасіў вялікія грошы за службу. Словы Эймунда маглі быць помстай князю за яго адказ. Мы хацелі б звярнуць увагу на характэрыстыку асобы абвінавачанага Святаполка з «Казання аб Барысе і Глебе»: «Святополк, сев на княжение после смерти отца, призвал к себе киевлян и, щедро одарив, отпустил. К Борису послал такую весть: «Брат, хочу жить с тобой в любви к полученному от отца владению добавлю ещё». Но не было правды в его словах… помыслы Святополка, второго Каина: хотел перебить он всех наследников отца своего, чтобы одному захватить всю власть. … Посланные Святополком пришли ночью и … без жалости было пронзено тело святого и блаженного страстотерпца Христова Бориса. Поразили его копьями окаянные: Путьша, Талец, Елович, Ляшко. … И не остановился на этом убийстве окаянный Святополк, но в неистовстве своём стал готовиться на большее преступление. … Когда убили Глеба, то бросили его в пустынном месте… А Ярослав, собрав войско, вышел навстречу Святополку: «Кровь брата моего вопиет к тебе, владыка. Молю тебя, господи, да будут отмщены братья мои!». После этих слов сошлись противники друг с другом и вступили в бой, а окаянный Святополк обратился в бегство».

*Суддзя.* — У бакоў ёсць яшчэ сведкі ці дакументы? Калі не, то слова для абвінавачвання прадстаўляецца пракурору.

*Пракурор.* — Як мы лічым, віна Святаполка Уладзіміравіча цалкам даказана. Ён з'яўляецца вельмі неўстойлівай у псіхічных адносінах асобай. Некалькі разоў уступаў у канфлікты, у тым ліку і са сваім бацькам Уладзімірам Святаслававічам, за што нават быў ім пасаджаны ў турму — поруб. Але Уладзімір памёр, не паспеўшы змяніць свайго запавета, і Святаполк заняў кіеўскі пасад. Ён адчуваў няпэўнасць свайго становішча і таму вырашыў ліквідаваць усіх прэтэндэнтаў на ўладу — сваіх братоў.Па яго загаду былі забітыя Барыс і Глеб, якія за свае пакуты і нявіннасць былі прызнаны святымі

хрысціянскай царквой. Паказанні кіраўніка дружыны Эймунда, апісаныя ў аднайменнай сазе, не заслугоўваюць увагі, таму што Эймунд меў асабістую непрыязнь да Яраслава і агаварыў яго. За свае дзеянні Яраслаў атрымаў пачэснае прозвішча «Мудры», з якім увайшоў у гісторыю. Такім чынам, мы лічым Святаполка вінаватым ў прад'яўленых яму абвінавачваннях.

*Суддзя.* — Дзякуй. Слова прадстаўляецца адвакату.

*Адвакат.* — Паважаныя прысяжныя! Абарона лічыць, што ніякіх падстаў для абвінавачвання Святаполка Уладзіміравіча ў гэтых страшэнных злачынствах няма. Ён з'яўляўся старэйшым сынам пасля смерці бацькі і законна сеў на кіеўскім пасадзе, што прызнаюць нават рускія летапісы. Тое, што ён сварыўся з бацькам, не ілюструе гэту справу. Бо спрэчкі Уладзіміра адбываліся з усімі сынамі, якія хацелі самастойнасці. І перад сваёй смерцю Уладзімір знаходзіўся ў спрэчцы з сваім сынам Яраславам, князем наўгародскім, які адмовіўся плаціць даніну Кіеву. І нават ладзіў паход на Ноўгарад, але заўчасна памёр. Таму мы лічым, што менавіта Яраславу была больш карысна смерць сваіх старэйшых братоў, бо ён па закону не меў правоў на кіеўскі пасад. І тыя злачынствы, у якіх абвінавачваецца Святаполк,

на самой справе былі здзейснены з загада Ярaслава, аб чым нам сведчаць незалежныя крыніцы такія як «Сага аб Эймундзе». А рускія летапісы пакрываюць Ярaслава, таму што ён спрыяў хрысціянізацыі Русі, у адрозненне ад старэйшых сыноў Уладзіміра, якія былі раўнадушнымі да яе, бо з'яўляліся прыхільнікамі язычніцкай веры продкаў. Забойства Барыса і Глеба было карысна менавіта Ярaславу, як і дыскрэдытацыя Святаполка. Менавіта Яраслаў пасля гэтых падзей становіцца князем кіеўскім. Мы лічым Святаполка невіноўным.

*Суддзя.* — Дзякуй. Паважаныя прысяжныя! Вынесеце, калі ласка, ваш вердыкт.

Прысяжныя выдаляюцца, каб параіцца. Пасля перадаюць паперу з адказамі на пытанні суддзі.

*Суддзя.* — Зачытвае пытанні і адказы.

1. Ці даказана, што Святаполк Уладзіміравіч з'яўляецца віноўным у развязванні міжусобнай вайны пасля смерці свайго бацькі князя Уладзіміра?
2. Ці даказана, што Святаполк Уладзіміравіч з'яўляецца віноўным ў смерці сваіх братоў Барыса і Глеба?

У залежнасці ад адказаў прысяжных выносіцца рашэнне па справе.

Праект прыгавора суда гісторыі

Суд у складзе суддзі, пракурора, адваката і прысяжных, разгледзеўшы ў ходзе расследавання матэрыялы па справе Святаполка Уладзіміравіча, па мянушцы «Акаянны», нарадзіўшагася у 975 годдзе, пражываючага і княжыўшага ў Тураве і Кіеве, абвінавачанага ў развязванні міжусобнай вайны і забойстве сваіх братоў Барыса і Глеба.

**Суд устанавіў** ----------------------------------------------------------------------

------------------------------------------------------------------------------------------------

------------------------------------------------------------------------------------------------

**Заключэнне суда:** Кіруючыся законамі гісторыі і чалавечымі нормамі справядлівасці , суд прыгаварыў:

1. Святаполка Уладзіміравіча па прад’яўленым яму абвінавачванні – прызнаць ------------------.

Судовае пасяджэнне скончана.

*Настаўнік.* — Вось мы з вамі і пачулі прыгавор. Справядлівы ён ці не? Аб гэтым гаварыць складана. Гісторыя — шматлікая, неадназначная, праблемная. І таму яе вывучэнне павінна адбывацца ўсебаковае. А чым скончыўся наш гістарычны дэтэктыў? Вы бачыце самі. Спадзяюся, што гэта было пазнавальна, цікава і захапляльна.

Па схеме «Гістарычны дэтэктыў. Незалежнае расследаванне» можна правесці ўрокі па наступным тэмам:

1. Дзе знаходзіцца крыж Ефрасінні Полацкай?
2. Хто па паходжанню вялікія князі літоўскія: скандынавы, балты ці славяне?
3. За што быў забіты Януш Радзівіл, «бацька» Кейданаўскай уніі?
4. Дзе знаходзяцца скарбы, вывезеныя Напалеонам?

## Урок «Унутраная і знешняя палітыка ВКЛ у XIV—XV стст.»

(Спаборніцтва ў стварэнні праграм навін палітыкі беларускага сярэднявечча)

*Мэты ўрока.*

*Вучэбная*: замацаванне ведаў вучняў па тэме, канкрэтызацыя агульных уяўленняў і ведаў, удасканальванне навыкаў працы з гістарычнымі крыніцамі, прымяненне ведаў у новай, нетыповай сітуацыі.

*Выхаваўчая*: выхаванне культуры працы ў камандзе,

*Развіваючая*: развіццё камунікатыўных якасцей.

*Тэхналогія*: гульнемадэліраванне.

Рэкамендуемая літаратура

Беларускія летапісы і хронікі. Беларускі кнігазбор. Мн., 1997

Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст. Хрэстаматыя / Пад рэд. Ю. М. Бохана. Мінск, 2009.

*Абсталяванне*: ватманы, фламастэры, нажніцы.

*Падрыхтоўка да ўрока.*

Настаўнік рыхтуе літаратуру ці робіць і раздрукоўвае матэрыялы са зборнікаў для працы вучняў.

### Х о д  у р о к а

### Уступнае слова настаўніка

Сёння нам даецца добрая магчымасць напоўніць «жывым» сэнсам змест галоўных палітычных падзей і тэндэнцый развіцця сярэднявечнай Беларусі. Можна сказаць, што наша галоўная мэта сёння — зрабіць так, каб «малюнак ажыў». А для гэтага мы сёння «зробім» навіны. Гэта будзе спаборніцтва дзвух сур'ёзных аналітычных каналаў навін. Нашы навіны будуць доўжыцца

10 хвілін і за гэты час вядучыя павінны даць каментарыі да галоўных і другарадных падзей палітычнага жыцця ВКЛ XIV—XV стст. Але для таго, каб навіны выйшлі на экран, трэба добра папрацаваць камандзе стваральнікаў навін — апрацаваць інфармацыйны паток (нашы гістарычныя крыніцы), вылучыць асноўныя падзеі, якія будуць з’яўляцца галоўнай сенсацыяй, і другарадныя, якія будуць фонам для асноўных падзей. Мы добра ведаем, што навіны «падаюць». Трэба будзе падумаць як іх падаць , каб было цікава, пазнавальна і не сумна. За працу, сябры!

*Арганізацыйны момант*: падзел класа на дзве каманды — два канала навін, забяспячэнне каманд ватманамі, нажніцамі, фламастэрамі для афармлення лагатыпа канала, застаўкі і інш. Потым настаўнік раздае патрабаванні да праграмы навін і рэкамендацыі з інфармацыйнымі матэрыяламі.

Ліст патрабаванняў да праграмы навін

(раздаецца вучням)

1. Прыдумаць назву, лагатып для канала навін і праграмы навін, якія б адлюстроўвалі спецыфіку падачы інфармацыі на канале, яго аўдыторыю і інш.

2. Тэрмін працы над навінамі — 20 хвілін (працуе ўся каманда). Час перадачы — 10 хвілін (прадстаўляюць вядучыя).

3. Патрабаванні да праграмы навін:

• наяўнасць анонса, вылучэнне галоўных падзей і з’яў у пачатку праграмы, прыцягненне ўвагі гледача;

• рэальнае адлюстраванне інфармацыйнай карціны перыяду VI—XV стст;

• тэматычны падыход і рознабаковасць;

- аналітычны каментарый (кароткія вывады: «Такім чынам, ...», «Галоўны вынік — …»);

- арыгінальнасць, «свой погляд».

☺ Цікава было б убачыць «сярэднявечную рэкламу» пад час паўзы.

Пытанні для працы з крыніцамі па тэме «Унутраная і знешняя палітыка ВКЛ у XIV—XV стст.»

Крыніца. Летапіс вялікіх князёў літоўскіх. Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст. Хрэстаматыя, 6 кл. / Пад рэд. Ю. Бохана, Мінск, 2009.

Крыніца. Хроніка Быхаўца. Беларускія летапісы і хронікі. Старонкі 99—101.

**1.** Чаму, на Ваш погляд, у ВКЛ у XIV—XV стст. адбываліся братазабойныя войны? Ці былі яны выкліканы характарам ўлады вялікага князя літоўскага (абсалютная, выбарная, дагаворная)?

**2.** Якія сродкі і метады выкарыстоўваліся ў гэтай барацьбе?

Крыніца. Летапіс вялікіх князёў літоўскіх. Гісторыя Беларусі, другая палова XIII—першая палова XVI ст. Хрэстаматыя, 7 кл. / Пад рэд. Ю. Бохана, Мінск, 2009.

**1.** Як у крыніцы тлумачацца прычыны заключэння Крэўскай уніі? Каму яна была больш выгадна: Вітаўту ці Ягайле? Каралеўству Польскаму ці Вялікаму княству?

**2.** Як Вы лічыце, нашы сучасныя гістарычныя ўяўленні аб гэтай падзеі складваюцца толькі на аснове гэтага дакумента?

Крыніца. Аповесць пра Падолле. Гісторыя Беларусі, другая палова XIII—першая палова XVI ст. Хрэстаматыя, 7 кл. / Пад рэд. Ю. Бохана, Мінск, 2009.

Ахарактарызуйце з дапамогай дакумента шляхі ўваходжання новых земляў ў склад ВКЛ і сістэму ўлады, якая склалася ў гэтых землях пасля іх уключэння ў ВКЛ.

Крыніца. Пахвала вялікаму князю Вітаўту. Гісторыя Беларусі, другая палова XIII—першая палова XVI ст. Хрэстаматыя, 7 кл. / Пад рэд. Ю. Бохана, Мінск, 2009.

Як у дадзеным дакуменце характэрызуецца ўплыў ВКЛ на міжароднай арэне ў пачатку XV стагоддзя? Дакажыце, што гэты дакумент быў створаны пасля Грунвальдскай бітвы.

Крыніца. Хроніка Быхаўца. Гісторыя Беларусі, другая палова XIII—першая палова XVI ст. Хрэстаматыя, 7 кл. / Пад рэд. Ю. Бохана, Мінск, 2009.

Якімі фактарамі выклікана дамоўленасць Ягайлы і Вітаўта аб уладзе пасля Грунвальдскай бітвы? Аб чым сведчыць жаданне Вітаўта быць каралём?

Крыніца. Хроніка Быхаўца. Беларускія летапісы і хронікі.

Якую ролю адыгрывала рэлігійнае пытанне ва ўнутранай палітыцы ВКЛ у 1430 г.? Чаму князь Свідрыгайла не атрымаў шырокай падтрымкі? Якія крокі Свідрыгайлы адштурхнулі яго паплечнікаў?

Пасля атрымання рэкамендацый да інфармацыйных матэрыялаў вучні на працягу 20 хвілін працуюць над сваёй праграмай, а потым на працягу 10 хвілін кожная каманда паказвае свае навіны. Такім чынам, кожная каманда пабывае ў якасці стваральнікаў, гледачоў і экспертаў, бо пад час прагляду навін каманды запаўняюць рэйтынгавы лісток. Цікавасць такога рэйтынгу ў тым, што яго састаўляюць каманды-канкурэнткі. Кожны вучань атрымлівае шкалу ацэнкі праграмы навін, куды і выстаўляе свае адзнакі. Рэйтынгавыя лісткі збіраюцца ва ўсіх членаў каманды, якая глядзіць навіны. У гэтых абставінах існуе добрая магчымасць праверыць сумленнасць і шчырасць вучняў, імкненне да аб’ектыўнай ацэнкі працы канкурэнтаў.

**Рэйтынг-ліст**

| Намінацыя | Балы (ад 1 да 10) |
|---|---|
| — назва, лагатып | |
| — анонс | |
| — інфармацыйная насычанасць | |
| — аналітычны каментарый<br><br>— markdown розна | |
| — арыгінальнасць | |

Балы суміруюцца. Абвяшчаецца каманда, якая перамагла. Настаўнік каменціруе вынікі і выстаўляе адзнакі за ўрок з улікам рэйтынг-лістоў.

## **Урокі па тэме: Рэфармацыйны рух і Контррэфармацыя у ВКЛ**

Гэтую складаную, шматзначную тэму мэтазгодна вывучаць, калі па сусветнай гісторыі прайшлі матэрыял па Рэфармацыі і вучням знаёмы асноўныя паняцці і гістарычныя факты.

Тэматычная распрацоўка складваецца з трох ўрокаў.

*Першы ўрок* — уводная лекцыя настаўніка (методыка праблемнага выкладання) па тэме «Праваслаўе і каталіцызм на беларускіх землях».

*Другі ўрок* — «Дыспут аб веры» па тэме «Рэфармацыйныя і контррэфармацыйныя працэсы ў другой палове XVI — пачатку XVII ст.» (гістарычная рэканструкцыя адбываўшыхся ў тыя часы дыспутаў з дапамогай гульнемадэліравання).

*Трэці урок* — абагульненне і праверачная работа па тэме «Царква і рэлігія ў XVI—пачатку XVII стст.».

Рэлігійнае жыццё і тэнденцыі ў развіцці культуры ў гэтыя стагоддзі звязваюць рэфармацыйныя і контррэфармацыйныя працэсы, вывучэнне якіх з’яўляецца нашай галоўнай мэтай. У Вялікім княстве Літоўскім Рэфармацыя была абумоўлена глыбокімі сацыяльна-гістарычнымі прычынамі і паўплывала на ўсе бакі культурнага жыцця: развіццё грамадскай і філасофскай думкі, палемічнай літаратуры, пашырэнне кнігадрукавання, развіццё мастацтва, асветы. Контррэфармацыя ацэньваецца як супярэчлівая і складаная эпоха, полілінгвістычная і поліканфесійная, што, безумоўна, паўплывала на працэс кансалідацыі беларускай народнасці, і ўвасобілася ў пануючым мастацкім стылі барока. Відавочна, што рэлігійныя пытанні і культурныя тэндэнцыі цесна звязаны, таму добрая прапрацоўка гэтай тэмы закладвае трывалы фундамент для вывучэння тэмы «Культура Беларусі ў XVI—пачатку XVII стст.».

*Першы урок.* На першым ўроку па тэме «Праваслаўе і каталіцызм на беларускіх землях» неабходна разглядзець асноўныя факты і падзеі царкоўнага і рэлігійнага жыцця напярэдадні пачатку рэфармацыйных і контрэфармацыйных працэсаў. Для гэтага вучням прапануецца скласці

табліцу, якую яны будуць запаўняць, слухаючы лекцыю настаўніка. Лекцыю мэтазгодна даваць па методыцы праблемнага выкладання (гл. пытанні табліцы), даючы магчымасць вучням выказвацца па пытаннях, а потым запаўняць табліцу. Па-першае, адразу адбываецца сістэматызацыя вывучаемага матэрыялу, па-другое, удасканальваюцца ўменні і навыкі канспектавання.

| **Пытанні** | **Праваслаўе** | **Каталіцызм** |
|---|---|---|
| 1. Калі і як з'явілася на тэрыторыі Беларусі? | 1.Хрысціянства прынята па візантыйскаму ўзору ў X ст. (Полацк, Тураў — епархіі) і паступова распаўсюдзілася на ўсю тэыторыю Беларусі. Язычніцтва доўгі час працягвала суіснаваць разам з хрысціянствам.<br><br>*Царква* — абраднасць праваслаўная, мова — царкоўнаславянская | 1.З'явіўся і пачаў распаўсюджвацца на тэрыторыі Беларусі як рэлігія вялікіх князёў літоўскіх у XIII ст. і суіснаваў побач з праваслаўем. Пасля Крэўскай уніі (1385 г.) і Гарадзельскага прывілея (1413 г.) знаходзіўся пад апекай дзяржавы, таму што статус еўрапейскай краіны патрабаваў пракаталіцкай арыентацыі кіруючых колаў.<br><br>*Касцёл* — абраднасць каталіцкая, мова — лацінская |
| 2. Калі і чаму дамінавала ? | 2. З'яўлялася самай распаўсюджанай і ўплывовай царквой у ВКЛ да канца XIV ст., потым пачынае страчваць уплыў (заняпад і падзенне Візантыі, прыняцце каталіцтва вялікімі князямі), але заставалася самай распаўсюджанай (колькасць веруючых) да канца XVI ст. | 2. З канца XIV ст. актыўна падтрымліваецца дзяржавай і структурна афармляецца (у 1387 г. утворана Віленскае біскупства) Рымска-каталіцкая царква пераўтвараецца ў буйнога землеўладальніка і валодае вялікім багаццем (у сярэдзіне XVI ст. памеры |

| | | |
|---|---|---|
| | Развіццё:<br>1316 г. — утварэнне «Літоускай мітраполіі» з цэнтрам у Наваградку.<br>1415 г. — абвяшчэнне незалежнасці праваслаўнай царквы ВКЛ (Рыгор Цамблак), 1458 г. — канчатковае адасабленне праваслаўнай царквы ВКЛ<br>Праваслаўныя змагаюцца за свае правы і ўлада ідзе на ўступкі: 1434 г. — прывілей Жыгімонта Кейстутавіча, 1563 г. — Жыгімонт II Аўгуст адмяняе Гарадзельскі прывілей, 1573 г. — «Акт Варшаўскай канфедэрацыі». | маёмасці перавысілі маёмасць праваслаўнай царквы) Пасля Люблінскай 1569 г. і Берасцейскай 1596 г. уній дамінуе ў дзяржаве, актыўна дзейнічаюць манаскія ордэны (дамініканцы, бернардзіны, францысканцы, аўгусціны), асабліва ордэн езуітау (барацьба з рэфармацыяй, асветніцкая дзейнасць).<br>Рымска-каталіцкая царква садзейнічала распаўсюджванню на тэрыторыі Беларусі заходнееўрапейскіх ўплываў, спрыяла развіццю навучальных установ, фарміраванню навуковых кадраў, прынесла культуру барока у галіне мастацтва |
| 3. Калі і чаму перажывал а крызіс? | 3.З пачатку XVI ст. знаходзіцца ў крызісным стане, выкарыстоўваецца Маскоўскай дзяржавай у палітычнай барацьбе з ВКЛ за ўплыў на праваслаўнае насельніцтва. Не падтрымліваецца дзяржавай, а толькі асобамі і грамадскімі арганізацыямі (брацтвы), застаецца традыцыйнай, нізкі ўзровень падрыхтоўкі святарства ў параўнанні з каталіцкай і пратэстэстанцкай цэрквамі з-за адсутнасці адукацыйных цэнтраў. Пасля Берасцейскай уніі ў заняпадзе, бо большасць епіскапаў на чале з мітрапалітам М.Рагозам прынялі ўніяцтва, страціла значную колькасць веруючых. | 3. Перажывала крызіс ў сярэдзіне XVI ст., калі ўплывовыя магнаты звярнуліся да пратэстантызма. Актыўна ўдзельнічала ў Контррэфармацыі: праводзіліся ў жыццё рашэнні Трыдэнцкага сабора. У канцы XVI—пачатку XVII ст. вярнула ўплыў (пануючае саслоуе амаль цалкам акаталічылася) Асаблівую ролю ў працэсе Контррэфармацыі адыгралі езуіты. Магнаты і шляхта пераходзілі ў каталіцтва з-за страха перад народным рухам, санкцый дзяржавы, з-за радыкалізма рэфармацыйных ідэй, адсутнасці адзінства ў рэфармацыйным руху. |
| 4. Асноўныя паняцці | 4. Мітраполія — епархія — прыход, брацтва, царква, патрыярх, ерась. | 4. Біскупства — парафія, ордэн, касцёл. |

| | | |
|---|---|---|
| 5. Дзеячы. | 5. К.Астрожскі, П. Магіла, А.Філіповіч. | 5. П. Скарга. |

Другі ўрок. «Дыспут аб веры» па тэме «Рэфармацыйныя і контррэфармацыйныя працэсы ў другой палове XVI—пачатку XVII ст.» (гістарычная рэканструкцыя адбываўшыхся ў тыя часы дыспутаў).

Структура і тэарэтычны змест папярэдняга ўрока тэмы быў прапрацаваны і зафіксаваны ў сшытках. Наступны этап — замацаванне матэрыялу, канкрэтызацыя і персаналізацыя ведаў непасрэдна па рэфармацыйнай і контррэфармацыйнай праблематыцы на ўроку-рэканструкцыі дыспута па пытаннях веры і рэлігіі.

*Мэты ўрока*

*Вучэбная*: фарміраванне ведаў вучняў па тэме, канкрэтызацыя агульных уяўленняў і ведаў, іх сістэматызацыя, удасканальванне ўменняў удзела ў дыскусіі, прымяненне ведаў у новай, нетыповай сітуацыі.

*Выхаваўчая*: фарміраванне ўстойлівых талерантных поглядаў на праблемы веравызнання і канфесійнай прыналежнасці, а таксама здольнасцей сацыяльнай інтэграцыі і культуры дыскусіі, павышэнне веры ў свае магчымасці.

*Развіваючая*: развіццё якасцей гуманістычнага светаўспрымання, пашырэнне кола пазнавальных інтарэсаў, развіццё крэатыўных якасцей асобы вучня.

*Тэхналогія*: гульнемадэліраванне (у кантэксце цывілізацыйнага, культуралагічнага і ментальнага падыходаў да вывучэння гісторыі).

*Абсталяванне*: падрыхтаваная аудыторыя (сталы растаўлены літарай «П» з таблічкамі з імёнамі прысутных), канспекты вучняў з індывідуальнымі заданнямі.

*Этапы ўрока:*

— Падрыхтоўчы;

— 1 частка. Правядзенне «Дыспуту аб веры» («пагружэнне» — 30 хвілін);

— 2 частка. Разбор дыспута аб веры. («рэфлексія» — 15 хвілін).

Падрыхтоўчы этап (інфармацыя аб тэхналогіі, праблемнае поле урока, індывідуальныя заданні вучням)

Інфармацыя аб гульнемадэліраванні

Адметнымі рысамі гэтага ўрока з’яуляюцца наступныя: ён распрацаваны на ідэях гульнемадэліравання і арганічна «упісаны» ў тэму праграмы. На погляд аўтара, каштоўнасць рэканструкцыі заключаецца ў тым, што яе можна выкарыстаць не толькі ў грамадска-гуманітарных класах, але і ў класах з іншымі профілямі ці увогуле без профіля. Гульнемадэліраванне — варыянт гульнетэхналогіі, на думку метадолагаў адукацыі О. А. Анісімава (1) і Ю. Грамыка (6) лічыцца вышэйшай формай педагагічнай дзейнасці, у якой ажыццяўляецца стварэнне ўмоў для рэалізацыі так званага «прынцыпа вырошчвання ведаў». Базавым працэсам ў ім з’яуляецца атаесамленне і раз’атаесамленне ўдзельніка з мадэллю чалавека мінулага ці іншай культуры, у якім ён атрымлівае штуршок да змены ўласнага ўзроўня, г.зн. да развіцця. Педагог у іграмадэліраванні выступае ў якасці сцэнарыста (адбірае змест маделяў-сцэнарыяў — падзей і з’яу мінулага ці іншай культуры), рэжысёра (карэкціруе ўсе стадыі ўвасаблення ўдзельнікаў, кіруе рэфлексіяй), акцёра (сам удзельнічае ў гульні) і крытыка (аналізіруе памылкі, недахопы, дасягененні). Гульнемадэліраванне, на думку аўтара, дазваляе забяспечыць выкладанне ў кантэксце новых падыходаў да гісторыі: цывілізацыйнага, культуралагічнага, ментальнага і аксіялагічнага, бо ўсіх іх аб’ядноўваюць такія катэгорыі як «вопыт», «менталітэт», «светаўспрыманне», «сістэма каштоўнасцей».

Інфармацыя аб дыспутах

Унікальнасць склаўшайся ў другой палове XVI ст. у ВКЛ канфесійнай сітуацыі, яе шматвектарнасць, спецыфічныя рысы і асаблівасці, адрозненні ад заходнееўрапейскай увасобіліся ў складзе мыслення, светаўспрымання, асаблівым ренесансным духу ў Вялікім княстве Літоўскім, рысамі якога былі рэлігійная талерантнасць, свабода творчасці і самавыражэння.

Поліканфесійнасць прывяла да росквіту палемічнай думкі і літаратуры. Акрамя публікацый сваіх лістоў, пасланняў, дзе выказваліся думкі па таму ці іншаму пытанню, адбываліся і сустрэчы дзеячоў на з’ездах (сінодах), дзе праходзілі дыспуты па абвешчанай праблематыцы. У гэтых спрэчках абмяркоўваліся розныя праблемы: ад хрысціянскага дагмата аб Святой Троіцы да пытанняў царкоўнай іерархіі і адносін да свецкай улады. Вось як аб дыспуце пратэстантаў у Іў’і, які пачаўся 18 студзеня 1582 г., успамінае яго удзельнік Сымон Будны: «… калі мы сабраліся ў прызначаным месцы, то нікога з іх не засталі, а на наступны дзень яны даслалі два ліста, у якіх гаварылі аб сваіх цяжкасцях і прычынах сваёй адсутнасці. Нам гэта было не па душы, таму што многія прыехалі з далёка і гарэлі жаданнем паслухаць дыспут». Размова ідзе аб працягу спора аб свецкай ўладзе, які быў пачаты ў 1581 г. ў Лоску, і на які не змаглі прыехаць так званыя «польскія браты». Як бачым, дыспуты адбываліся даволі часта, але наша мэта не рэканструкцыя аднаго з іх, а стварэнне нейкай «ідэальнай» мадэлі — дыспута, дзе будуць палемізаваць дзеячы, якія не змаглі гэтага зрабіць у рэальнасці і прадставіць свае думкі, якія дайшлі да нас. Кола пытанняў, якое будзе абмяркоўвацца на гэтым дыспуце, таксама будзе большае, чым звычайна (гэта было адно—два пытання), і будуць спрачацца паміж сабой прадстаўнікі розных плыняў. Гэтыя патрабаванні неабходна выканаць, каб дасягнуць пастаўленых мэт ўрока. Таксама неабходна звярнуць увагу на тое, што рэлігійная і культурная атмасфера XVII ст. істотна адрозніваюцца ад папярэдняга стагоддзя. Можна ўстанавіць прычыны і асаблівасці гэтых працэсаў, сам механізм змен культурных каштоўнасцей і яго наступствы цераз светапогляд удзельнікаў дыспута.

**Індывідуальныя заданні вучням**

На першым уроку (яшчэ па сусветнай гісторыі пры вывучэнні тэмы па Рэфармацыі за два тыдні да ўрока-дыспута), неабходна даць вучням план падрыхтоўкі да дыспута і індывідуальныя заданні. Вучні павінны будуць падрыхтаваць матэрыялы аб адзеячах па наступным плане:

1. Біяграфічныя звесткі (дата і месца нараджэння, сям’я, выхаванне, атрыманая адукацыя — коратка).

2. Галоўныя творы, іх тэматыка, змест (коратка).

3. Выказванні і думкі аўтараў аб рэлігіі, веры, царкве, аб арганізацыі свецкай і духоўнай улады, погляды на пераклады Бібліі, аб справядлівасці і законах.

4. Звесткі аб паслядоўніках, уплыве думак дзеяча, аб яго смерці.

Вучні рыхтуюць матэрыялы аб наступных дзеячах: Сымоне Будным, Васілі Цяпінскім, Канстанціне Астрожскім, Мікалаі Радзівіле Чорным, Пятры Скарзе, старцы Арцеміі і Феадосе Касым, Іясафаце Кунцэвічы, Мяленціі Сматрыцкім, Казіміры Лышчынскім.Некалькі вучняў могуць падрыхтаваць і выступаць ад імя аднаго дзеяча (гэта нават цікавей, калі на дыспуце прысутнічаюць два «Будных», не кожны з іх можа сабрацца і адказаць на пытанні, адказваць будуць па-рознаму). Абавязкова трэба прасачыць, каб былі прадстаўлены думкі П.Скаргі, С.Буднага, І.Кунцэвіча, К.Лышчынскага. Трэба папарэдзіць і настроіць вучняў, што ім прыдзецца выступаць ад першага імя. Абавязкова парэкамендуйце даведачную літаратуру.

**1 частка. Правядзенне «Дыспуту аб веры»** («пагружэнне» — 30 хвілін)

Арганізацыйны момант: неабходна падрыхтаваць загадзя аудыторыю: стварыць адпаведную атмасферу (пасадзіце разам праваслаўных з праваслаўнымі, кальвіністаў з кальвіністамі і г. д.), азнаёміць ўдзельнікаў з правіламі правядзення дыспуту. Павітайце сабраўшыхся на дыспут ў характэрнай манеры, папрасіце ад імя старшыні прытрымлівацца правіл дыспуту і паводзіць сябе прыстойна, без абраз на імя апанентаў. Сябе лепш не атаясамляць з канкрэтнай гістарычнай асобай, лепш гэта будзе зборны вобраз і імя, бо ў іншым выпадку ваша гістарычна вядомая ангажыраванасць не дазволіць вам быць сапраўдным арбітрам дыспуту. Пачаць дыспут трэба з прадстаўлення прысутных: хто, адкуль прыехаў, якую плынь прадстаўляе, мэта з’яўлення на дыспуце. Далей прапануйце пытанні для абмеркавання.

1. Вы ведаеце, што мы з вамі сёння сабраліся на дыспут аб веры? А ці можна аб гэтым увогуле спрачацца?

2. Што для вас азначае «вера»? У што вы верыце? Што для вас з’яуляецца аўтарытэтам веры?

3. Як вы ставіцеся да перакладаў Бібліі? Навошта яны патрэбны? Ці можна крытычна адносіцца да тэкстаў Свяшчэннага Пісання?

4. Што такое царква? Навошта яна існуе?

5. Ці можна рэфармаваць царкву і навошта гэта рабіць? Якой яна павінна быць?

6. Як вы ставіцеся да ідэі уніі цэркваў?

7. Як павінны ўзаемадзейнічаць царква і улада? Якой павінна быць палітыка па рэлігійнаму пытанню ў дзяржаве?

Гэта галоўныя пытанні, якія трэба абмеркаваць прысутным. Мэта выкладчыка-старшыні гэтага дыспуту: абвастраць ці гасіць дыскусію, стымуляваць і нават правакаваць актыўнасць удзельнікаў, а таксама фіксаваць памылкі і недакладнасці ў прэзентацыі ўдзельнікамі поглядаў асоб, ад імя якіх яны выступаюць, але рабіць гэта непрыкметна для акружаючых. Увогуле, ідэальны варыянт — адсняць дыспут на відэа, каб потым выкарыстаць плёнку пры аналізе дыспуту. Вельмі важна падтрыманне асобага духу, атмасферы: мова, манеры, выкарыстанне тагачаснай тэрміналогіі. Неабходня забяспечыць умовы стварэння сітуацыі «ўжывання» і «погляда знутры».Самае галоўнае: павінен быць атрыманы непасрэдны вопыт, пражывання падзеі ў якасці яе удзельніка.

Каментарыі да адказаў вучняў на пытанні

Пры адказе на першае пытанне адбываецца наступнае: прадстаўнікі праваслаўных і каталікоў, негледзячы на значныя супярэчнасці, якія існуюць паміж імі, будуць адзінадушнымі: вера — цэнтральная светапоглядная пазіцыя, а таксама псіхалагічны ўнутраны стан чалавека. Чалавек без веры парывае сваю сувязь з Богам, адпадае ад Бога. Гэтай пазіцыі прытрымліваюцца і пратэстанты, але прадстаўнік кожнай з канфесій

удакладняе, што «ісціннай» верай лічыць менавіта сваю: праваслаўную, каталіцкую, кальвінісцкую. Супрацьлеглую пазіцыю займае Казімір Лышчынскі, які лічыў, што уяўленні людзей пра Бога з'яўляюцца вынікам іх фантазіі і памылак. Гэта выклікае абурэнне амаль ва ўсіх прысутных.

Другое пытанне арганічна выцякае з першага. Адказваючы на яго, робяцца акцэнты на ўласныя думкі і перажыванні, але каталікі і праваслаўныя абавязкова падкрэсліваюць сувязь веры з царквой, набажэнствамі і абрадамі. А пратэстанты гавораць аб веры як аб непасрэднай сувязі веруючага з Богам, без пасрэдніцтва царквы, таму і адмаўляюць неабходнасць яе існавання. Спрэчка разгараецца, калі заходзіць размова аб сімвале веры — галоўным хрысціянскім дагмаце аб Святой Троіцы, які падтрымліваюць ўсе ўдзельнікі дыспута, акрамя антытрынітарыяў і атеістаў. Антытрынінатарыі прызнавалі аўтарытэт «Свяшчэннага пісання» (тым самым адмаўляючы ўсе царкоўныя кнігі акрамя Бібліі) і абаранялі права кожнага чалавека тлумачыць біблейскія запаветы, прызнавалі Богам толькі Бога-Айца, а Ісуса Хрыста лічылі простым чалавекам.

Трэцяе пытанне дыспута аб крытычных адносінах да тэкстаў Бібліі выклікае незадаволенасць праваслаўных і каталікоў. Яны негатыўна ставяцца да ідэі магчымасці кожнаму чалавеку самому тлумачыць біблейскія запаветы, лічаць , што гэта вядзе да багахульства і ўвогуле да адпадзення ад Бога.

Пытанне аб царкве з'яўляецца адным з самых вострых: праваслаўныя будуць даводзіць да сабраўшыхся ідэі дамінавання менавіта праваслаўнай царквы таму, што яна, застаючыся традыцыйнай, амаль не змянялася на працягу стагоддзяў і таму з'яўляецца «сапраўднай» царквой, як у «старыну». Католікі будуць крытыкаваць такую пазіцыю праваслаўных, лічачы, што яна не рэагуе на патрэбы часу, што прыводзіць да заняпаду царквы як духоўнай установы. Таксама і католікі і пратэстанты будуць крытыкаваць праваслаўных за нізкі ўзровень падрыхтоўкі святарства з-за адсутнасці добрых адукацыйных цэнтраў. Праваслаўныя будуць крытыкаваць царкоўную іерархію каталіцкай царквы, галоўным чынам пасаду Папы

рымскага. Галоўная паленіка будзе разгортвацца па пытанню царкоўнай маёмасці і багаццяў, а таксама ўдзела царквы ў палітыцы, таму пытанне аб радыкальным рэфармаванні царквы будзе адвергнута і каталікамі і праваслаўнымі. Пратэстанты будуць прапаноўваць адабраць ў царквы яе багацці, зямлю, ліквідаваць манастрыры, спрасціць культ, адмовіцца ад пышнай царкоўнай абраднасці.

Ідэі царкоўнай ўніі ў першую чаргу будуць прапагандавацца каталікамі і ўніятамі, што выклікае абуранасць ў праваслаўных артадоксаў, асабліва неабходнасць падпарадкавання Папе рымскаму. Таму абавязкова зойдзе размова і аб свецкай ўладзе, аб дзяржаве. Праваслаўных будзе непакоіць тое, што дзяржаўныя колы не падтрымліваюць царкву, аддаючы перавагу каталікам і ідэі царкоўнай уніі. Пратэстанты будуць настойваць на тым, што царква не павінна ўмешвацца ў палітычныя гульні, а займацца толькі духоўным жыццём, бо паслядоўнікі ідэй Ф. Соцына (сацыніяне) будуць выступаць за аддзяленне царквы ад дзяржавы, усталяванне верацярплівасці. Якой павінна быць дзяржава і законы ў ёй? Радыкальныя погляды прысутнічаючых на дыспуце расійскіх вальнадумцаў аб ліквідацыі дзяржавы ўвогуле і усталяванні замест дзяржаўных законаў божаскіх запаведзяў, будуць абвергнуты большасцю прысутных, бо выражаюць патрабаванні гарадскіх нізоў і сялян. У заключэнне дыспуту кожны з прысутных выкажацца аб працягу сваёй справы ў будучым, зыходзячы з ведаў аб персаналіях.

**2 частка. Разбор «Дыспуту аб веры»** («рэфлексія» — 15 хвілін)

Адразу неабходна ўключыцца ў разбор перажытога. Зрабіць гэта можна, карыстаючыся матэрыяламі канспектаў вучняў і нататак настаўніка. Трэба карэктна выкрыць памылкі і недакладнасці ў прэзентацыі вучнямі поглядаў дзеячоў, ад імя якіх яны выступалі. Гэта робіцца не больш за 10 хвілін. У заключэнне неабходна правесці сярод вучняў наступнае рэфлексіўнае міні-апытанне:

1. Ці даведаўся я сення нешта новае па гісторыі, аб сваіх аднакласніках, аб самім сабе?

2. Што я лічу самым важным з ўсяго, што адбылося на ўроку?

3. Ці ўяўляе сенняшні ўрок для мяне асабіста нейкую каштоўнасць?

Выстаўленне адзнак вучням з абавязковым каментарыем (ацэньваюцца не толькі прэзентацыя вучнем поглядаў дзеяча без памылак, але і ўжыванне ў вобраз, актыўнасць на дыспуце).

Дамашняе заданне: працяг і запаўненне табліцы на аснове азнаямлення са зместам вучэбнага дапаможніка і атрыманых на дыспуце ведаў па раздзелам «Пратэстантызм» і «Уніяцтва».

**Трэці урок — паўторнае абагульненне і праверачная работа па тэме «Царква і рэлігія ў XVI—пачатку XVII ст.»**

Пачаць урок трэба з праверкі дамашняга задання. Вучні павінны былі самастойна запоўніць табліцу далей. Вось што павінна было ў іх атрымацца.

| Пытанні | Пратэстантызм | Уніяцтва |
|---|---|---|
| 1. Калі і як з'явілася на тэрыторыі Беларусі? | 1.Рэфармацыйныя ідэі пранікли на беларускія землі з Германіі і Швейцарыі ў першай палове XVI ст. і пачалі распаўсюджвацца «зверху» магнатамі, якія ў сваіх уладаннях пачалі ўтвараць кальвінскія зборы, запрашалі прапаведнікаў, выдаткавалі сродкі на пераклады Бібліі.<br><br>Кальвінізм — асноўная плынь Рэфармацыі ў ВКЛ (распаўсюджанне лютэранства, цвінгліянства нязначнае). У адрозненне ад праваслаўнай ці | 1. Спроба заключэння царкоўнай уніі была зроблена яшчэ ў 1439 г. — Фларэнтыйская унія. Уніяцтва распаўсюджвацца на беларускіх землях пасля заключэння Берасцейскай царкоўнай ўніі (1596). Грэка-каталіцкая царква замяніла традыцыйную праваслаўную. Не ўсе царкоўныя іерархі прызналі рашенне Берасцейскага царкоўнага сабора.<br><br>Прычыны прыняцця уніі.<br><br>*1.* Знешнепалітычныя: супрацьстаянне прэтэнзіям Маскоўскай дзяржавы (у 1589 г. ўвядзенне патрыяршаства давала |

| | | |
|---|---|---|
| | каталіцкай цэркваў, пратэстанты адмаўлялі царкоўную арганізацыю тыпу каталіцкай ці праваслаўнай; рэлігійны культ быў істотна спрошчаны і больш танны. Пратэстанты не валодалі зямельнымі. ўладаннямі, не ўмешваліся ў палітыку.<br><br>У пратэстантызме няма інстытута манаства і бясшлюбнасці духавенства, якое выбіраецца вернікамі ці прызначаецца патронам (магнатам, на землях якога ўтварылася абшчына).<br><br>Рэфармацыйныя плыні: шляхецка-бюргерская і плябейска-сялянская.<br><br>**Кальвінскі збор**: мова набажэнстваў — польская, беларуская. | ідэалагічнае абаснаванне падпарадкавання праваслаўных ВКЛ маскоўскаму патрыярху). *2.* Унутрыпалітычныя: знаходжанне праваслаўнай царквы ВКЛ ў глыбокім крызісе (праваслаўныя магнаты, якія прынялі пратэстанцкія погляды, пад уплывам контррэфармацыйнай палітыкі дзяржавы не вярталіся назад у праваслаўе, а станавіліся каталікамі. Гэта падштурхнула частку праваслаўных іерархаў да уніі.<br><br>**Грэка-рымская** царква падпарадкоўвалася папе рымскаму; абраднасць захоўвалася праваслаўная; мова — польская, царкоўнаславянская, беларуская. |
| 2. Калі і чаму дамінавала? | 2. У першай палове XVI ст. шырока распаўсюджваецца сярод магнатаў, шляхты, багатых гараджан. Магнаты будуюць пратэстанцкія зборы, школы, друкарні. Ажыўляецца рэлігійна —філасофскае жыццё, адбываюцца дыспуты, пануе | 2. Ніколі уніяцтва не з’яўлялася пануючай канфесіяй ў дзяржаве, але была самай распаусюджанай па колькасці веруючых да сярэдзіны XIX ст. Уніяцкая царква была ўмацавана рэформамі мітрапаліта І. Руцкага (павышэнне ўзроўня падрыхтоўкі святарства, стварэнне ордэна |

| | | |
|---|---|---|
| | рэлігійная талерантнасць. Прычыны дамінавання — палітычныя. З дапамогай пратэстанцкіх ідэй магнаты Радзівілы імкнуліся пазбавіцца ад ўплыву праваслаўнай Маскоўскай дзяржавы і каталіцкай Польшчы. | базыльян і базыльянскіх школ). Уніяцтва садзейнічала захаванню беларускай мовы і этнаса ва ўмовах паланізацыі і акаталічвання (набажэнствы ў царкве адбываліся на беларускай мове). |
| 3. Калі і чаму перажывала крызіс? | 3. Перажывала крызіс у канцы XVI—пачатку XVII ст., таму што перастала падтрымлівацца ўплывовымі магнатамі (заўчасная смерць Мікалая Радзівіла Чорнага, пачатак Контррэфармацыі). Асаблівую незадаволенасць праваслаўных і каталікоў выклікала радыкальная плынь — антытрынітарыі, ці арыяне, якія не падтрымліваліся памяркоўнымі пратэстантамі.<br><br>Пачынаючы з пачатку XVII ст. у Рэчы Паспалітай існуюць толькі асобныя пратэстанцкія абшчыны. У 1658 г. сейм прыгаварыў антытрынітарыяў да выгнання за межы Рэчы Паспалітай. | 3. Уніяцкая царква падтрымлівалася дзяржавай на працягу свайго існавання, але да яе ставіліся як да другараднай. Былі пастаянныя спробы ўзмацнення ціску на ўніяцкую царкву. Асноўная маса веруючых — сяляне, мяшчане , дробная шляхта.Грэка-рымская царква не багатая, адзін ордэн — базыльянскі. У 1839 г. на Полацкім царкоўным саборы была далучана да Рускай Праваслаўнай царквы. |
| 4. Асноуныя паняцці | Дыстрыкт — збор, кальвінізм, лютэранства, цвінгліанства, анабаптызм, антытрынітарыі (арыяне), сацыніяне. | 4. Унія, базыльянскі ордэн, грэка-рымская царква. |

| | | |
|---|---|---|
| 5. Дзеячы. | С. Будны, В. Цяпінскі, М. Радзівіл Чорны, Якуб з Калінаўкі, Павел з Візна. | 5. І. Кунцэвіч, І. Пацей, К. Цярлецкі. |

Улічваючы зробленае дамашняе заданне, трэба пачаць паўторнае абагульненне. На дошцы змешчаны падагульняючыя пытанні па тэме.

**1.** Як можна ахарэктэрызаваць рэлігійную сітуацыю ў ВКЛ у XVI—XVII ст.? Што садзейнічала яе змяненню?

**2.** У чым вы бачыце прычыны распаўсюджання ідэй Рэфармацыі сярод розных сацыяльных колаў грамадства ВКЛ?

**3.** Чым Рэфармацыя ў ВКЛ адрознівалась ад заходнееўрапейскай? Чым можна патлумачыць існаванне радыкальных плыняў арыян, сацыніян?

**4.** Чаму менавіта ў Рэчы Паспалітай удалося заключыць царкоўную унію ў 1596 г.? У чым прычыны даволі хуткага распаўсюджання уніяцтва?

**5.** Ці можна лічыць заключэнне уніі асаблівасцю працэса Контррэфармацыі ў ВКЛ? Чаму?

**6.** Якім чынам падзеі XVI—XVII ст. паўплывалі на сённяшняе рэлігійнае становішча ў нашай краіне?

Праца можа быць як індывідуальная, так і групавая: на кожную групу з 4 чалавек па аднаму пытанню, час на падрыхтоўку адказа — 4-5 хвілін, потым па чарзе на працягу 15 хвілін — адказы: вучні павінны аргументаваць свой пункт погляду, зыходзячы з набытых ведаў па дзеячах Рэфармацыі і Контррэфармацыі — удзельніках прайшоўшага на папярэднім уроку дыспуту.

Галоўныя высновы

**1.** Рэлігійная сітуацыя: складаная і супярэчлівая, адчуваюцца моцныя ўплывы заходнееўрапейскіх ренесансных і рэфармацыйных працэсаў, а таксама знаходжанне ў сферы палітычнай экспансіі Маскоўскай дзяржавы. Вырашэнне рэлігійнага пытання (прыняцце і распаўсюджанне

пратэстантызма ў ВКЛ магло спрыяць адстойванню незалежнасці дзяржавы ад уплываў каталіцкай Польшчы і праваслаўнага Маскоўскага царства і рэалізацыі амбіцыёзных планаў асобных магнатаў, напрыклад, Мікалая Радзівіла Чорнага.

**2.** Прычыны распаўсюджання ідэй Рэфармацыі ў ВКЛ: наяўнасць рэлігійных супярэчнасцей на фоне абвастрэння сацыяльнай і палітычнай барацьбы. Сацыяльная база рэфармацыйных працэсаў — феадальная знаць, якая імкнулася ўмацаваць сваё становішча за кошт канфіскацыі царкоўных зямель, частка сярэдняй і дробнай шляхты, якая знаходзілася ў сферы ўплыву магнатаў. Спрыяла распаўсюджанню рэфармацыйных ідэй і навучанне ў заходнеўрапейскіх універсітэтах.

**3.** Рэфармацыя ў ВКЛ — састаўная частка еўрапескага рэфармацыйнага руху. Яе галоўныя асаблівасці: 1) ахапіла толькі вышэйшыя колы грамадства, не стала сапраўдным народным рухам; 2) наяўнасць радыкальных плыней (арыянства і сацыніяне) тлумачыцца больш цярпімай, талерантнай абстаноўкай у поліканфесійнай дзяржаве ВКЛ. Не было праяў нецярпімасці, праследванняў і ганенняў інквізіцыі, накшталт «варфаламееўскай ночы». Найбольшае распаўсюджанне на беларускіх землях атрымаў антытрынітарызм — рэфармацыйная плынь гуманістычнага і рацыяналістычнага кшталту, прадстаўленая С. Будным, В. Цяпінскім, якія не выступалі за карэнныя перамены сацыяльнага жыцця як радыкалы (Пётр з Ганёндза, Якуб з Калінаўкі), якія выражалі патрабаванні народных мас і канфліктавалі з памяркоўнымі. У канцы XVI ст. антытрынітарызм пад уплывам ідэй Ф. Соцына перараджаецца з рэлігійнай у філасофскую дактрыну. Сацыніяне стаялі на пазіцыях верацярплівасці, аддзялення царквы ад дзяржавы.

**4.** Прычынамі заключэння ўніі менавіта ў Рэчы Паспалітай з'яўляліся: крызіснае становішча праваслаўнай царквы ў другой палове XVI ст., наступствы Лівонскай вайны і палітыкі Маскоўскай дзяржавы па ідэалагічным абаснаванні абароны праваслаўя. Рэч Паспалітая была

падрыхтавана да рэлігійнай ўніі неаднаразовымі дзяржаўна-палітычнымі ўніямі (Крэўская, Люблінская), а таксам неабходнасцю цэнтралізацыі дзяржавы, дзе поліканфесійнасць магла прывесці да страты самастойнасці. Насаджэнне ўніяцтва завяршылася пасля паўстанняў (Магілёўскае ў 1618 г., Віцебскае ў 1623 г.) і правядзення рэформ І. Руцкага, якія спрыялі пашырэнню ўплыву ўніяцкай царквы.

**5.** Унію можна лічыць асаблівасцю працэса Контррэфармацыі ў ВКЛ: быў згорнуты рэфармацыйны рух, магнаты і шляхта, прыняўшыя кальвінізм, вярнуліся ў каталіцтва, уніяты падпарадкаваліся папе рымскаму. Але менавіта уніяцкая царква садзейнічала ў далейшым захаванню беларускага этнасу (адбылася беларусізацыя богаслужэнняў). Унія дала актыўны штуршок да росквіту літаратуры і грамадска-філасофскай думкі (палемічныя творы).

**6.** Поліэтнічнасць і поліканфесійнасць насельніцтва ВКЛ паўплывалі на фарміраванне менталітэту беларускага насельніцтва, бо ў тыя часы завяршаліся працэсы фарміравання беларускай народнасці. З аднаго боку, неспрыяльна паўплывалі акаталічванне і паланізацыя вярхоў і значных сярэдніх слаёў, пачынаючы з XVII ст. З другога боку, рысамі «ментальнай» характарыстыкі беларусаў з’яўляюцца памяркоўнасць, цярпімасць — талерантнасць, і Беларусь не з’яўляецца арэнай міжэтнічных і міжканфэсійных канфліктаў. Тут мірна суіснуюць прадстаўнікі мноства канфесій. Для ілюстрацыі апошніх вывадаў можна прывесці інфармацыю па сённяшняму рэлігійнаму становішчу.

У астатнія 25 хвілін урока праводзіцца праверачная работа па тэме «Царква і рэлігія ў XVI—XVII ст.».

**Праверачная работа па тэме: «Царква і рэлігія ў XVI—XVII ст.»**

*Варыянт 1*

1. Суаднясіце :

| | |
|---|---|
| 1) Ф. Касы; | А) уніяцкі царкоўны дзеяч; |
| 2) М. Сматрыцкі; | Б) антытрынітарый, выданне «Катехізіса»; |
| 3) С. Будны; | В) праваслауны палеміст, аўтар «Граматыкі славенскай»; |
| 4) І. Кунцэвіч. | Г) лідэр еретычнага руху ў Расіі, збег у ВКЛ. |

2. Што аб’ядноўвае гэтыя паняцці, назвы, імёны:

А) францысканцы, бернардзіны, дамініканцы.

Б) І. Пацей, І. Кунцэвіч, К. Цярлецкі.

В) збор, дыстрыкт, сінод.

3. Вызначце, што з’яўляецца лішнім у прапанаваных радах імён, паняццяў:

1) М.Сматрыцкі; П. Скарга; П. Магіла.

2) патрыярхат; біскупства; парафія.

4. Запоўніце параўнальную табліцу:

| **Асаблівасці Контррэфармацыі** | **Заходняя і Цэнтральная Еўропа** | **ВКЛ** |
|---|---|---|
| | 1. Галоўныя накірункі і праявы.<br>2. Сродкі распаўсюджвання.<br>3. Вынікі распаўсюджвання. | |

На аснове праведзенага параўнання зрабіце адпаведныя вывады.

5. Працягніце лагічны ланцужок. 1439 → 1569 → 1589 → … . Патлумачце сувязь паміж падзеямі, даты якіх прыводзяцца ў ланцужку. Абаснуйце выбар падзеі, якая , на ваш погляд, замыкае лагічны ланцужок.

*Варыянт 2*

1.Суаднясіце:

| | |
|---|---|
| 1) П. Скарга; | А) лідэр рэфармацыйнага руху ў ВКЛ; |
| 2) В. Цяпінскі; | Б) езуіт, аўтар твора «Аб адзінстве Царквы Божай»; |
| 3) І. Пацей; | В) антытрынітарый, пераклад «Евангелля»; |
| 4) М. Радзівіл Чорны. | Г) уніяцкі царкоўны дзеяч. |

2. Што аб'ядноўвае гэтыя паняцці, імёны, назвы:

А) М. Радзівіл Чорны, С. Будны, В. Цяпінскі.

Б) Заблудаў, Лоск, Нясвіж, Цяпіна.

В) мітраполія, епархія, прыход.

3. Вызначце, што з'яўляецца лішнім у прапанаваных радах імён, паняццяў:

1) С. Будны; І. Пацей; В. Цяпінскі.

2) францысканцы; бернардзіны; базыльяне.

4. Запоўніце параўнальную табліцу:

| **Асаблівасці Рэфармацыі** | **Заходняя і Цэнтральная Еўропа** | **ВКЛ** |
|---|---|---|
| | Галоўныя плыні<br>Сацыяльная база<br>Вынікі | |

На аснове праведзенага параўнання зрабіце адпаведныя вывады.

5. Працягніце лагічны ланцужок: 1569 → 1596 → 1618, 1623 → … .

Патлумачце сувязь паміж падзеямі, даты якіх прыводзяцца ў ланцужку. Абаснуйце выбар падзеі, якая , на ваш погляд, замыкае лагічны ланцужок.

Адказы на прверачную работу па тме «Царква і рэлігія»

*Варыянт 1*

1.Суаднясіце: 1Г, 2В, 3Б, 4А.

2. Што аб’ядноўвае: А) прадстаўнікі каталіцкіх ордэнаў, якія дзейнічалі на беларускіх землях; Б) уніяцкія царкоўныя дзеячы; В) кальвінізм.

3. Што лішняе: 1. П.Скарга (каталік). 2. Патрыярхат (праваслаўе).

Лагічны ланцужок: 1596 г. — Берасцейская царкоўная унія (лагічны ланцужок утрымлівае даты шляху да уніі).

*Варыянт 2*

1. Суаднясіце:1Б, 2В, 3Г, 4А.
2. Што аб’ядноўвае:А) пратэстанцкія дзеячы; Б) цэнтры, дзе існавалі друкарні; В) структура праваслаўнай царквы.
3. Што лішняе:1. І.Пацей (уніяцкі царкоўны дзеяч). 2. Базыльяне (адзіны уніяцкі ордэн).

Лагічны ланцужок: 1633 г. — аднаўленне праваслаўнай іерархіі у РП, стварэнне Магілёўскай праваслаўнай епархіі ( ланцужок ілюструе падзеі этапу гвалтоўнага насаджэння уніяцтва на беларускіх землях).

**Рэкамендуемая літаратура для настаўніка:**


1. *Анисимов, О. С.* Педагогическая акмеология: общая и управленческая. М., 2002.
2. *Алексютович, Н. А.* Будный — идеолог гуманизма и реформации в Белоруссии и Литве// Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии. Мінск, 1962.
3. Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII—XVIII). Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т.3. Мінск, 2004.
4. *Блинова, Т. Б.* Иезуиты в Белоруссии. Мінск, 1990.
5. *Барыс, С. В.* Адраджэнне рэлігійнага жыцця ў Беларусі ў 1988-2003 гг. // Беларускі гістарычны часопіс, 2004, № 5.
6. *Громыко, Ю. В.* Мыследеятельностная педагогика: теоретико-практическое руководство по освоению высших образцов педагогического искусства. Мінск, 2000.
7. *Дмитриев, М. В.* Православие и реформация: Реформационные движения в восточнославянских землях Речи Посполитой во второй половине ХУІ в. М., 1990.
8. Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии. Сборник АН БССР. Мінск, 1962.
9. *Марозава, С. В.* Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596-1839 гады). Гродна, 2001.
10. *Подокшин, С. А.* Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы: Вторая половина XV—начало XV в.. Мінск, 1970.
11. *Падокшын, С. А.* Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: Ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага. Мінск, 1990.
12. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 1—6. Мінск, 1993-2004.
13. Артыкулы: *Адраджэнне, Рэфармацыя, Контррэфармацыя, Палемічная літаратура, С. Будны, В. Цяпінскі, Ф. Касы, М. Сматрыцкі, П. Скарга, І. Пацей, К. Лышчынскі.*

## Рэкамендуемая літаратура для вучняў:

1. *Асветнікі зямлі беларускай X—пачатку XX ст. Энцыклапедычны даведнік, Мінск, 2001.*
2. *Тарасаў К. Памяць пра легенды. Мінск, 1994.*
3. *Рэлігія і царква.Энцыклапедычны даведнік. Мінск, 2001.*

## Спіс літаратуры (Да «Дні культуры ВкЛ»):

1. *Белы А. Хроніка Белай Русі.Нарыс гісторыі адной геаграфічнай назвы. Мн., 2000*
2. *Ермаловіч М.І .Па слядах аднаго міфа. Мн., 1991*
3. *Ермаловіч М.І. Старажытная Беларусь: Віленскі перыяд. Мн., 1994*
4. *Краўцэвіч А.К. Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага. Мн., 1998*
5. *Лойка П.А. Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітыным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XYI – першай трэці XYII ст. Мн., 2001*
6. *Мальдзіс А.І. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XYIII стагоддзя. Мн., 1982*
7. *Насевіч В.Л. Пачаткі Вялікага княства Літоўскага: Падзеі і асобы. Мн., 1993.*
8. *Сагановіч Г.М. Войска Вялікага княства Літоўскага ў XYI – XYII ст. Мн., 1994*
9. *Сагановіч Г.М.Невядомая вайна: 1654-1667.Мн., 1995*
10. Тарасаў К. *Памяць пра легенды. – Мн., 1990.*
11. *Ткачоў М.А. Замкі і людзі. Мн., 1991*
12. *Трусаў А.А. Старонкі мураванай кнігі. Мн., 1990*
13. *Чаропка В. Імя ў летапісе. Мн, 1994*
14. *Чаропка В. Уладары Вялікага княства. Мн, 1996,2002,2007*
15. *Юхо Я.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Мн., 1992*

**Урок: Інтэлектуальны марафон «Ад Адраджэння да Асветніцтва»**

Тэма: Эпоха Асветніцтва і яе ўплыў на развіццё культуры Беларусі

Урок паўторнага абагульнення і кантроля ведаў .

*Мэты ўрока:*

*Вучэбная*: абагульненне і сістэматызацыя ведаў вучняў, прымяненне ведаў у новай, нетыповай сітуацыі.

*Выхаваўчая*: выхаванне культуры працы ў камандзе.

*Развіваючая*: пашырэнне сферы інтарэсаў вучняў, развіццё крэатыўнасці.

Этапы ўрока.

**1.** Арганізацыйны (падзел на 4 каманды, выбар назваў для каманд, азнакамленне з умовамі конкурсаў).

**2.** Гульня: конкурсы «Знайдзі памылку», «Гістарычны партрэт», «Пытанне на пытанне».

**3.** Падвядзенне вынікаў і выстаўленне адзнак.

Умовы конкурсаў

| **Назва конкурса** | **Што адбываецца** | **Як ацэньваецца** |
|---|---|---|
| 1. «Знайдзі памылку». | Кожная каманда атрымлівае аднолькавы тэкст з памылкамі, якія трэба знайсці (1 бал) і правільна выправіць за кожную памылку (2 бала)на працягу 5 хвілін. | 1 бал — за знойдзеную памылку.<br>2 бала — за выпраўленую памылку.<br>1 бал — камандзе, якая датэрмінова выканала заданне. |

| | | |
|---|---|---|
| 2. «Гістарычны партрэт». | Настаўнік зачытвае невялікія характэрыстыкі гістарычных дзеячоў, а кожная каманда афармляе адказы на маленькіх аркушах паперы і аддае іх настаўніку. | За кожны правільны адказ па 5 балаў (3 партрэта). |
| 3. «Пытанне на пытанне» | Каманды на працягу 10 хвілін складаюць міні-красворд (7 слоў) і малююць яго на дошцы.Адказваюць іншыя каманды. Хто хутчэй правільна адкажа на пытанне, атрымлівае 1 бал. За наяўнасць неразгаданых слоў каманда-аўтар атрымлівае дадаткова па 1 балу за кожнае слова. | За кожны правільны адказ 1 бал. |
| Заключны этап | Падвядзенне вынікаў. | Складваюцца балы. |

**Заданні конкурсаў**

**Тэкст з памылкамі**

Эпоха Асветніцтва, перыяд росквіту якой прыпадае на другую палову XYIII стагоддзя, — вельмі важны і значны этап у гісторыі еўрапейскай цывілізацыі. У гэты час назіраўся сапраўдны «пераварот у розумах»: пераасэнсоўваліся погляды на рэлігію, грамадства, прыроду. Не стаяла ў баку і Рэч Паспалітая, дзе адбываліся значныя перамены.

У галіне асветы вядучая роля належала базыльянам, якія ўтваралі свае калегіумы. Яны лічыліся ўзорнымі навучальнымі установамі. Але патрэбы часу дыктавалі прынцыпы свецкага навучання, якое было агучана пад дэвізам: «Моладзь не для касцёла, а для дзяржавы».У 1773 г. было створана другое ў Еўропе дзяржаўнае міністэрства народнай асветы — Адукацыйная камісія Рэчы Паспалітай. Першым старшынёй Адукацыйнай камісіі стаў Ігнацый Масальскі, прыхільнік папулярнай ў тыя часы асветніцкай тэорыі меркантылізма.

У 1781 г. на базе былой езуіцкай Віленскай акадэміі была ўтворана Галоўная Літоўская школа, рэктарам якой стаў выдатны вучоны-хімік М. Пачобут-Адляніцкі. У вышэйшай навучальнай установе новага тыпу — Галоўнай Літоўскай школе — склаўся моцны прафесарскі корпус. Знакаміты натураліст Ж. Жылібер па выніках сваёй даследчыцкай дзейнасці выдаў кнігу «Фауна Літвы».

Прыхільнікі новых асветніцкіх ідэй паходзілі з магнацкага асяроддзя, напрыклад, самымі значнымі дзеячамі-рэфарматарамі з’яўляліся І.Храптовіч, які замяніў у сваіх маёнтках Шчорсы і Вішнева паншчыну на чынш, і А.Тызенгаўз, які запрашаў знакамітага Д.Дзідро пасяліцца ў Бярэсці.

Асветніцкімі ідэаламі кіраваўся і магнат Міхал Клеафас Агінскі, які ажыццявіў грандыёзны праект будаўніцтва канала, звязваючага басейны Чорнага і Балтыйскага мораў.

Магнацкія сядзібы сталі культурнымі цэнтрамі: Нясвіж ,Слуцк, Слонім, Ружаны. У Нясвіжы, празваным «паўночнымі Афінамі», ажыццяўляла свае пастаноўкі жанчына-драматург Францішка Уршуля Радзівіл.

## Памылкі ў тэксце

Эпоха Асветніцтва, перыяд росквіту якой прыпадае на другую палову XYIII стагоддзя, — вельмі важны і значны этап ў гісторыі еўрапейскай цывілізацыі. У гэты час назіраўся сапраўдны «пераварот у розумах»:

пераасэнсоўваліся погляды на рэлігію, грамадства, прыроду. Не стаяла ў баку і Рэч Паспалітая, дзе адбываліся значныя перамены.

У галіне асветы вядучая роля належала **базыльянам** (іезуітам), якія утваралі свае калегіумы.Яны лічыліся ўзорнымі навучальнымі установамі. Але патрэбы часу дыктавалі прынцыпы свецкага навучання, якое было агучана пад дэвізам: «Моладзь не для касцёла, а **для дзяржавы** (а для народа)» У 1773 г. было створана **другое ў Еўропе** (першае ў Еўропе) дзяржаўнае міністэрства народнай асветы — Адукацыйная камісія Рэчы Паспалітай. Першым старшынёй Адукацыйнай камісіі стаў Ігнацый Масальскі, прыхільнік папулярнай ў тыя часы асветніцкай тэорыі **меркантылізму (**фізіякратызму).

У 1781 г. на базе былой езуіцкай Віленскай акадэміі была ўтворана Галоўная Літоўская школа, рэктарам якой стаў выдатны вучоны-**хімік** (астраном) М.Пачобут-Адляніцкі. У вышэйшай навучальнай установе новага тыпу — Галоўнай Літоўскай школе склаўся моцны прафесарскі корпус. Знакаміты натураліст Ж.Жылібер па выніках сваёй даследчыцкай дзейнасці выдаў кнігу «**Фауна** (флора) Літвы».

Прыхільнікі новых асветніцкіх ідэй паходзілі з магнацкага асяроддзя, Напрыклад, самымі значнымі дзеячамі-рэфарматарамі з'яўляліся І.Храптовіч, які замяніў ў сваіх маёнтках Шчорсы і Вішнева паншчыну на чынш, і А.Тызенгаўз, які запрашаў знакамітага французскага асветніка **Д. Дзідро** (Ж.Ж.Русо) пасяліцца ў **Бярэсці** (Белавежскай пушчы).

Асветніцкімі ідэаламі кіраваўся магнат Міхал **Клеафас** (Казімір) Агінскі, які ажыццявіў грандыёзны праект будаўніцтва канала, што звязаў басейны Чорнага і Балтыйскага мораў.

Магнацкія сядзібы сталі культурнымі цэнтрамі: Нясвіж ,Слуцк, Слонім, Ружаны. У **Нясвіжы (**Слоніме**),** празваным «паўночнымі Афінамі»,

ажыццяўляла свае пастаноўкі **жанчына-драматург Францішка Уршуля Радзівіл** ( яна ажыццяўляла свае пастаноўкі менавіта ў Нясвіжы).

## Гістарычныя партрэты

### Гістарычны партрэт № 1

1. Ён скончыў Кіева-Магілянскую акадэмію і прыняў манаства.
2. Ён быў настаўнікам рускага цара Фёдара Аляксеевіча і царэўны Соф’і.
3. Ён заснаваў крамлёўскую друкарню, з якой выйшла шмат кніг па гісторыі, геаграфіі і іншым навукам.
4. Ён заўсёды служыў ісціне: «Знающе правду, а о ней молчати — есть злато в землю тщетно закопати».

### Сімяон Полацкі

### Гістарычны партрэт № 2

1. «Ён пачаў апранацца ў сармацкую вопратку, а ў палітычных гульнях таленавіта іграў ролю сармацкага караля — захавальніка і абаронцы традыцый «залатых шляхецкіх вольнасцей».
2. Ён вёў даволі эксцэнтрычны лад жыцця, любіў шакіраваць сваіх сучаснікаў.
3. Ён увайшоў у гісторыю як легкадумны палітык і абмежаваны чалавек, удзельнічаў у розных бітвах то на адным то на другім баку.

### Кароль Станіслаў Радзівіл — «Пане Каханку».

### Партрэт № 3

1. У свой час скончыў Гродзенскі езуіцкі калегіум, потым выкладаў у Віленскай езуіцкай акадэміі, стаў на шлях рэформ і пасля узначалення Галоўнай Літоўскай школы надаў працэсу навучання амаль свецкі характар.

2. Гэты вучоны-прыродазнавец стаў членам Каралеўскай акадэміі ў Лондане і членам-карэспандэнтам Французскай Каралеўскай акадэміі.

3. Плённа займаўся навукай: стварыў астранамічную абсерваторыю ў Вільні, займаўся вывучэннем планет Сонечнай сістэмы, нават адкрыў новае сузор'е.

4. Удзельнічаў у паўстанні 1794 г., уваходзіў у рэвалюцыйны урад ВКЛ.

Марцін Пачобут-Адляніцкі.

## Рэкамендуемая літаратура:


1. *Алексютович, Н. А.* Будный — идеолог гуманизма и реформации в Белоруссии и Литве // Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии. Мінск, 1962.
2. Барока ў беларускай культуры і мастацтве. Пад рэд.В. Ф.Шматава. Мінск, 2001.
3. Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII-XVIII). Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т.3. Мн., 2004.
4. *Барышев, Г. И.* Театральная культура Белоруссии XVIII в. Мінск, 1992.
5. *Блинова, Т. Б.* Иезуиты в Белоруссии. Мінск, 1990.
6. *Барыс, С. В.* Адраджэнне рэлігійнага жыцця ў Беларусі ў 1988-2003 гг. // Беларускі гістарычны часопіс, 2004, № 5.
7. *Дмитриев, М. В.* Православие и реформация: Реформационные движения в восточнославянских землях Речи Посполитой во второй половине XVI в. М., 1990.
8. *Марозава, С. В.* Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596-1839 гады). Гродна, 2001.
9. *Мальдзіс, А. І.* Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII ст. Мінск, 1982.
10. *Подокшин, С. А.* Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы: вторая половина XV— начало XV в.. Мінск, 1970.
11. *Падокшын, С. А.* Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: Ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага. Мінск, 1990.
12. *Тарасаў, К.* Памяць пра легенды. Мінск, 1994ж.
13. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т 1—16. Мінск, 1993-2004 гг.
14. Артыкулы: *Асветніцтва, Тэатр, Агінскія, Радзівілы, С. Полацкі, М. Пачобут-Адляніцкі.*

## Урок: Круглы стол «Сістэмны крызіс Рэчы Паспалітай»

Тэма: Наш край ў сярэдзіне XVI-XVIII ст.

*Мэты ўрока.*

*Вучэбная*: замацаванне ведаў вучняў па тэме, канкрэтызацыя агульных уяўленняў і ведаў па дзяржаўна-палітычным і сацыяльна-эканамічным працэсам у Рэчы Паспалітай.

*Выхаваўчая*: выхаванне культуры працы ў камандзе.

*Развіваючая*: развіццё камунікатыўных якасцей.

*Метад*: праблемнае выкладанне.

*Дзейнасць*: групавая.

Ход урока

Настаўнік вітае вучняў, абвяшчае тэму і мэты круглага стала і ставіць перад вучнямі праблему, якую неабходна вырашыць на працягу ўрока.

*Праблема.* У другой палове XYIII ст. Рэч Паспалітая спыніла сваё існаванне пасля трох падзелаў яе тэрыторыі паміж Расійскай, Прускай і Аўстрыйскай імперыямі. Ці можна лічыць, што галоўнай прычынай гэтых падзей з’явілася наяўнасць магутных суседзяў, якія прэтэндавалі на землі Рэчы Паспалітай? Чаму народныя масы заставаліся раўнадушнымі да лёсу дзяржавы, былі пасіўнымі і амаль не ўдзельнічалі ў барацьбе за захаванне самастойнасці Рэчы Паспалітай?

Ці можа даць нам адказы на гэтыя пытанні вывучэнне сацыяльна-эканамічных працэсаў? Як гэтыя працэсы звязаны з дзяржаўна-палітычнымі і этнічнымі працэсамі?

Каб паспрабаваць адказаць на дадзеныя пытанні, неабходна разбіцца на групы, кожная з якіх атрымае сваё заданне.

*Заданні для груп.* Для працы над праблемай стварающца пяць груп: «Эканамісты», «Палітолагі», «Сацыёлагі», «Культуролагі» і «Міжнароднікі», якія атрымліваюць свае праблемныя пытанні і творчае заданне. Праца над пытаннямі 10 хвілін. На першыя два пытанні вучні адказваюць коратка, выкарыстоўваючы асноўныя паняцці па тэме. Трэцяе заданне носіць творчы характар, таму неабходна каб усе групы прадставілі свой варыянт разам (спачатку кожная група адказала на першыя два пытанні і вучнні разам з настаўнікам прыйшлі да галоўных высноў. А прадстаўленне адказаў на трэцяе пытанне будзе ілюстраваць гэтыя высновы. Творчыя заданні групам можна было даць для падрыхтоўкі загадзя, як хатняе заданне.).

*Палітолагі*: Праца са зместам вучэбнага дапаможніка па пытаннях:

1. Коратка ахарактэрызуйце эвалюцыю асноўных інстытутаў улады у Рэчы Паспалітай ад Люблінскай уніі да яе падзелаў. Якія галоўныя тэндэнцыі вы можаце вылучыць?

2. Якія рэформы неабходна было правесці ў сістэме дзяржаўнага кіравання, каб захаваць дзяржаву? Якія рэформы былі праведзены? Ці мелі яны поспех?

*Паняцці*. Дэцэнтралізацыя, сейм, саслоўна-прадстаўнічая манархія, шляхецкая анархія, магнацкая рэспубліка, залатыя шляхецкія вольнасці, канфедэрацыя, «ліберум вета».

*Творчае заданне.* Прадстаўце з класам мадэль аднаго з пасяджэнняў сейма ў Рэчы Паспалітай па выбарах караля (наглядная дэманстрацыя сістэмы ўлады ў дзяржаве). На чым вы будзеце засяроджваць увагу?

**Эканамісты:** Праца са зместам вучэбнага дапаможніка па пытаннях.

1. Чаму на тэрыторыі Рэчы Паспалітай у XVI ст. усталявалася фальваркава-паншчынная сістэма? Ці можна лічыць яе эфэктыўнай гаспадарчай сістэмай у XVIII ст.?

2. Параўнайце эканамічнае развіццё Рэчы Паспалітай і заходнееўрапейскіх краін па пытанню наяўнасці базы для развіцця капіталістычных адносін. Ці маглі эканамічныя рэформы ўратаваць Рэч Паспалітую ад распаду?

*Паняцці.* Паншчына, чынш, валока, латыфундыя, гвалт, згон, рэформы А.Тызенгаўза.

*Творчае заданне.* Складзіце калектыўную сялянскую скаргу землеўладальніку на арандатара.

**Сацыёлагі:** Праца са зместам навучальнага дапаможніка**.**

1. Коратка ахарактэрызуйце становішча асноўных сацыяльных груп (саслоўяў) у грамадстве Рэчы Паспалітай: правы і абавязкі, прывілегіі, уплыў ў дзяржаве.

2. У чым прычыны сацыяльных канфліктаў у Рэчы Паспалітай? Якія найбольш значныя праявы гэтых канфліктаў вы можаце прывесці? Ці ставілася пытанне адмены прыгону?

*Паняцці.* Залатыя шляхецкія вольнасці, прыгон, пахожыя і непахожыя сяляне, мяшчане, паўстанне В.Вашчылы.

*Творчае заданне.* Прадстаўце размову збяднелага шляхціца і селяніна пасля паўстання на Крычаўшчыне.

**Культуролагі:** Праца са зместам навучальнага дапаможніка па пытаннях.

1. Як паўплывала шматканфесійнасць насельніцтва Рэчы Паспалітай на лёс дзяржавы? Ці лічыце вы дзяржаўную палітыку кіруючых колаў аптымальнай у гэтым пытанні?

2. Ці можна сцвярджаць аб наяўнасці дзвюх культур у Рэчы Паспалітай — культуры пануючага саслоўя і народнай культуры? Як у XVII—XVIII стст.

сказваліся працэсы ў культурна-моўнай галіне на фарміраванні самасвядомасці беларускага этнасу?

*Паняцці.* Канфесія, дысідэнты, уніяцтва, білінгвізм, Адукацыйная камісія, прыгонны тэатр.

*Творчае заданне.* Складзіце ліст ад імя якога-небудзь вандроўніка з іншай краіны з апісаннем уражанняў ад магнацкага балю, свята, тэатральнай пастановы і праездам цераз вёску.

**Міжнароднікі:** Праца са зместам навучальнага дапаможніка па пытаннях.

1. Ахарактарызуйце эвалюцыю знешнепалітычнага становішча Рэчы Паспалітай з 1569 да 1795 г. Як паўплывалі на яго войны сярэдзіны XVII — XVIII стст.?
2. Чаму іншыя краіны маглі ўмешвацца ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай? Што паслужыла прычынай страты незалежнасці Рэчы Паспалітай?

**Паняцці:** канфедэрацыя (Слуцкая, Торуньская, Барская, Таргавіцкая), Пецярбургская канвенцыя, рокаш, «маўклівы» сейм.

**Творчае заданне:** Прадстаўце сумеснае пасяджэнне манархаў дзяржаў, якія ўдзельнічалі ў працэсе падзелаў Рэчы Паспалітай.

## Літаратура:

1. Анішчанка Я. К. Беларусь ў часы Кацярыны II. Мн., 1998
2. Барышев Г. И. Театральная культура Белоруссии XVIII века.Мн., 1992
3. Дзмітрачкоў П. Ф. Беларусь у складзе Вялікага княства Літоўскага. Другая палова XIII — першая палова XVII стагоддзяў. Мн., 2003
4. Емельянчык У. П. Паланез для касінераў. З падзей паўстання 1794 г. пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі на Беларусі. Мн., 1994
5. Лойка П. А. Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі: Эвалюцыя феадальнай рэнты ў др. пал. XYI- п.т. XYII ст. Мн., 2001
6. Мальдзіс А. І. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XYIII ст. Мн., 1982
7. Беларусь у часы Рэчы паспалітай. Гісторыя Беларусі у 6 т. Т.3 Мн.. 2004
8. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Мн. 1993-2003